Саколка ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Юбілей Нараўкі ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 28 (2774) Год LIV | Беласток, 12 ліпеня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

На парозе дваццаткі

Інтэрв'ю з арганізатарамі юбілейнага фестывалю „Басовішча"

„Ніва": — Юбілейны фестываль „Басовішча" сёлета ладзяць дзве маладыя, поўныя энергіі дзяўчаты. Ці з-за гэтага фестываль будзе мець нейкія жаночыя адметнасці?

Кася Кузьміч: — Мне здаецца, што нельга так думаць, бо гэта не мае ніякага значэння, хто ладзіць фестываль.

Мажэна Саевіч: — А можа мы проста гэтага не бачым...

Кася: — З другога боку вядома, як гэта бывае ў жанчын: мусіць быць парадак, усё мусіць быць выпраўлена да канца. Хаця не ведаю, ці зараз ужо ўсё так да канца нам атрымалася. Можна будзе гэта ацаніць пасля „Басовішча".

Мажэна: — Калі я была нядаўна ў нейкай фірме, жанчына сказала: „О, усюды жанчыны, і добра, бо што з гэтых мужчын" (*смех*).

„Ніва": — Ці на момант перад фестывалем можаце сказаць, што ў арганізацыйным плане ўсе мары і планы здзейсніліся?

Кася: — Ніколі нельга сказаць, што ўсё атрымалася, але думаю, што ў 80 працэнтах нам удалося зрэалізаваць свае задумы.

Мажэна: — Я была ўражана сёлетняй сітуацыяй, бо з моманту выбараў новага праўлення БАС, у якім мы апынуліся, нам засталіся толькі чатыры месяцы арганізацыйнай працы. Думаю, што зараз будзе больш камфортна думаць пра наступны год.

„Ніва": — Што не атрымалася з Вашых планаў?

Кася: — Не давядзецца паказаць поўнасцю рэтраспектывы, каб „Брага", „Бонда" і „Мроя" выступілі ў старых саставах музыкаў. Але напэўна будзе нейкі ўхіл у гэты бок. Няма чаго аднак сумаваць, бо праз год будзе дваццацігоддзе „Басовішча" ўвогуле. Гэта дзіўна камусьці тлумачыць, што сёлета дваццаты фестываль (першы адбыўся ў 1990 г.), якому ў сапраўднасці дзевятнаццаць гадоў, але так яно ёсць і праз год будзе лепш.

„Ніва": — Бася Пякарская, першы арганізатар, сказала, што самым важным дасягненнем выпрацаваным гадамі з'яўляецца вольная сцэна і конкурсная частка. Вернецеся да гэтых элементаў?

Мажэна: — Так, толькі ў гэтым годзе адмовіліся мы ад гэтага, бо хацелі памяняць крыху фестываль, былі абмежаваныя часам, а праз год пачнем новае дваццацігоддзе і будзе на тое месца.

Кася: — Думаю, што для гэтага будзе патрэбны трэці дзень.

Мажэна: — Вядома, што не ўсё залежыць ад нас стопрацэнтна... як заўсёды, праблема ў грашах.

Фота Ілоны Карпюк

Злева: Мажэна Саевіч і Кася Кузьміч

„Ніва": — Чым прывабнае „Басовішча" на фоне дзесяткаў фестываляў, якія зараз ладзяцца ў Польшчы, бо іх колькасць значна вырасла?

Кася: — Хвалявалася я таксама з-за гэтага, што 17-18 ліпеня якраз адбываюцца фестывалі ў Сувалках, Беластоку, Ярочыне і можа там людзям будзе цікавей. Але з другога боку столькі людзей прамільгнула праз наш фестываль і адведала Барык, што заўсёды ёсць слухачы, якія плануюць свой прыезд паўгода раней. Такога фестывалю больш няма, нават у свеце.

Мажэна: — Музыка тут зусім іншая, чым на ярацінскім ды іншых фестывалях.

Кася: — Фестываль гэта таксама месца сустрэч з іншымі людзьмі, дзе можна пагуляць, патусавацца. Для палякаў гэта вельмі цікава, што прыязджаюць беларусы, бо можна сустрэцца з іншай культурай.

„Ніва": — А што тады самае важнае не для палякаў, толькі для беларусаў Падляшша?

Кася: — Гэта жывы кантакт з музыкай, з людзьмі. Гэта нешта такое адчувальнае, што чуеш уласнымі вушамі, бачыш уласнымі вачамі і можаш да гэтага дакрануцца.

Мажэна: — Ёсць таксама шмат беларускападобных фестываляў, дзе сустрэнеш толькі фальклор, а тут сучасная беларуская музыка, якую ствараюць гурты з Беларусі і з Падляшша на сапраўды высокім узроўні і гэта вельмі важнае для беларусаў з Польшчы.

„Ніва": — Які шлях прадбачваеце для „Басовішча" ў будучыні?

Кася: — Цяжкае пытанне. Думаю, арганізатары першых фестываляў не адказалі б на гэтае пытанне, бо не ведалі, што будзе дваццатае „Басовішча". Думаю, што дачакаемся другой дваццаткі. Гэта будзе цяжка, бо бачым хаця б на прыкладзе БАСу, калі гэтых людзей амаль няма. Але так як сказаў Лёнік Тарасэвіч, здаецца, 10 гадоў таму назад, трэба чакаць новага пакалення, якое ўвядзе нейкія змены. Я таксама спадзяюся на гэтае новае пакаленне. Можа яно ўжо ёсць, не ведаю; будзе відаць з перспектывы часу.

„Ніва": — А ці варта захоўваць гэтую незалежнасць, некамерцыйнасць фестывалю?

Кася: — Я таксама раней думала, што варта пайсці ў камерцыйны бок, бо вядома — больш грошай, але зараз мне здаецца, што ўсімі сіламі трэба бараніць некамерцыйнасць, бо гэта шэдэўр побач іншых польскіх фестываляў. Зараз шмат закідаў аб камерцыйнасці „Басовішча", але мне здаецца, што на фоне іншых мерапрыемстваў гэтай з'явы ў нас няма. Праз пяць гадоў такіх фестываляў зусім не будзе, таму трэба захаваць некамерцыйнасць, гэтую дзікасць „Басовішча".

„Ніва": — Што скажаце тым, якія збіраюцца на „Басовішча"?

Мажэна: — Каб узялі палаткі (*смех*), а так па-сур'ёзнаму...

Кася: — ... што гэты фестываль дае шмат чаго самому чалавеку, дазваляе адкрываць самога сябе. Нават тыя, якія не адчуваюць сябе беларусамі, а сустрэнуць беларуса, напэўна штосьці зразумеюць, пабачаць, што няма бар'ер, бо яны без праблемы дагаворацца. Для мяне такія фестывалі адкрываюць вочы, падказваюць, што яшчэ можна зрабіць у жыцці. Запрашаем тых, якія яшчэ не былі, каб пераканаліся, што такое „Басовішча".

„Ніва": — Які канцэрт для Вас асабіста можа стаць гітам?

Мажэна: — „Крама" і „Нейра Дзюбель".

Кася: — А для мяне „Уліс", бо сапраўды шмат гадоў я яго не бачыла.

Гутарыла Ілона КАРПЮК

17-18.07

Пасол РП у Мінску ☞ 5

Генрык ЛІТВІН

Многае Лета

Рэдакцыя НІВЫ і Радыё РАЦЫЯ віншуюць

ІЛОНУ КАРПЮК
і
РАДАСЛАВА ДАМБРОЎСКАГА

са шлюбам і пачаткам супольнага здзяйсняння мараў.
Шчасці Вам Божа!!!

9 770546 196000

Тролі мумій

Атрымаў я 3 ліпеня як абанент адной з мабільных сетак, што дзейнічаюць у Беларусі, ажно два разы вішавальны SMS. У паведамленні вішавалі мяне ў ліку многіх іншых карыстальнікаў тэлефоннай мабільнай сувязі з „Днём независимости” і ў дадатак запрашалі на святочны дармовы канцэрт расійскага гурту „Мумий Тролль”. Не будучы аматарам халяўных забаваў, не пайшоў і на гэты раз на анансаваны выступ досыць вядомага і папулярнага калектыву, але яго назва падалася мне глыбока сімвалічнай у звязку з тымі пампезнымі ўрачыстасцямі, якія ладзіць дзяржава пад назвай Рэспубліка Беларусь на 3 ліпеня. Як вядома, тролі — гэта істоты міфалогіі, злыя духі, якія заўсёды варожыя чалавеку. Да нас прыйшлі яны са скандынаўскіх казак і легендаў, а зараз часта фігуруюць у так званай літаратуры-фэнтэзі.

Адкуль жа прыйшоў у беларускую рэчаіснасць згаданы „День независимости”? Нават школьнік з сярэднімі ведамі па гісторыі ведае, што 3 ліпеня 1944 года ад фашысцкіх войскаў быў вызвалены горад Мінск. Хай сабе і сталіца, але толькі канкрэтны горад. Значная частка беларускай зямлі яшчэ заставалася пад гітлераўскай акупацыяй. Каму ж спатрэбілася гэтую фальшывую дату нават вызвалення ад фашызму рабіць да ўсяго „Днём независимости”? А патрэбна гэта тым, хто замест грамадзянскай супольнасці, якая будзе ведаць сапраўдную гісторыю і будзе ганарыцца нацыянальнымі героямі і славутымі старонкамі беларускай мінуўшчыны, хоча стварыць у краіне паслухмяную замбіраваную „працоўную масу”, што будзе слухаць правадыра і кленчыць перад уладай у нізкім паклоне з удзячнасцю за тое, што свеціць сонца, а неба вісіць над галавою.

Вайна — гэта вялікая трагедыя, Другая сусветная стала такой практычна для ўсіх краін і народаў Еўропы. Менавіта так, як трагедыя і каласальная бяда, яна ўспрымаецца ў пераважнай большыні сённяшніх дзяржаў кантынента і ўсяго свету. І толькі тролям ад ідэалогіі ў Беларусі і Расіі замест нармальнага, прыцішанага і хрысціянскага ўшанавання памяці мільёнаў палеглых ахвяр, замест асэнсавання прычын вайны і ролі ў ёй дзяржавы СССР, якая была такім жа нечалавечым монстрам, як і фашыстоўская Нямеччына, патрэбная „Вялікая перамога”, патрэбныя вайсковыя парады з дэманстрацыяй магутнасці жалезнай тэхнікі, патрэбныя тысячы людзей на пляцах з затлумленымі галовамі. Ім непатрэбная „Вялікая памяць”, ім патрэбная менавіта „Вялікая перамога”. Перамога, якую яны прыватызавалі, перамога, да якой яны не маюць аніякага дачынення. Ім патрэбныя фальшывыя куміры-ідалы — „сталіны” і „жукавы”, якія дасягалі сваіх мэт коштам вялізных ахвяр, якіх можна было б пазбегнуць. Ім патрэбная „великая страна, которую они потеряли”, якая, акрамя вайсковых франтоў і фашыстоўскіх канцлагераў, загубіла мільёны нявінных людзей у савецкіх канцлагерах да, падчас і ўжо пасля той жахлівай вайны. Ім патрэбная мумія крывавага сусветнага правадыра і ідэолага дыктатуры пралетарыяту Леніна, цела якога яны так зацята не хочуць аддаваць зямлі. Ім патрэбная прывілеяваная каста „ветэранаў”, бальшыня з якіх падчас той вайны была альбо дзецьмі, альбо займалася карнымі экспедыцыямі супраць антысавецкага супраціву. Ім, ідэалагічным тролям сучаснасці, патрэбная такая гісторыя, якая будзе абслугоўваць іх уладу, іх маёмасць, іх асабістую недатыкальнасць, іх права не лічыцца з сумленнасцю, законнасцю, прынцыпамі маральнасці. І таму яны не шкадуюць аніякіх грошай (па розных ацэнках толькі на ўрачыстасці ў Мінску пайшло ад 50 да 70 мільёнаў долараў), робяць выходныя і ўсяляк зацягваюць на пляцы людзей.

Цікава, што якраз гэтага 3 ліпеня ў нашай старажытнай сталіцы Вільні парламенцкая асамблея АБСЕ прыняла (пры рэзкім супраціве расійскай дэлегацыі) знакавую рэзалюцыю, якая ўскладае роўную адказнасць за пачатак Другой сусветнай вайны на нацысцкую Нямеччыну і тагачасны СССР. А дзень 23 жніўня, калі быў падпісаны ганебны пакт Молатава-Рыбентропа, прапаноўваецца адзначаць як дзень памяці ахвяр сталінізму і нацызму. Толькі ці не запозна зрабілі гэта еўрапейскія палітыкі? Рэальныя, а не ўяўныя, тролі сталінізму ўжо набралі сілу і з'яўляюцца рэальнай пагрозай свету.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Часопіс „Снапок”

У травеньска-чэрвеньскім нумары віленскага часопіса „Беларускі летапіс” за 1937 год была надрукавана аб'яўка аб тым, што 1 траўня 1937 года ў Варшаве пры газеце „Слово”, якая выдаецца праваслаўнай мітраполіяй, пачаў выходзіць новы беларускі ілюстраваны царкоўна-культурны часопіс для дзяцей „Снапок”. Ён з'яўляецца дадаткам да газеты і дзеткі яго змогуць чытаць кожны месяц.

Сапраўды, першыя тры нумары „Снапка” напачатку ліпеня 1937 года ўжо прадаваліся ў Варшаве на вуліцы Парыжскай, 27, а таксама ў Вільні ў кнігарні „Пагоня” на Завальнай вуліцы, 1 і ў іншых месцах.

Рэдактарам часопіса „Снапок” быў беларускі дзеяч на ніве царкоўнай асветы, багаслоў, педагог і перакладчык Сяргей Паўловіч (1875-1940). Родам ён быў з вёскі Асавец Кобрынскага павета (цяпер Драгічынскі раён). Скончыў духоўную семінарыю ў Вільні і Кіеўскую духоўную акадэмію. Акадэмію Сяргей Паўловіч у 1900 годзе скончыў са ступенню кандыдата багаслоўя. Працаваў у царкоўных установах, выкладчыкам настаўніцкай семінарыі і жаночай гімназіі ў Рагачове. Пяць гадоў быў інспектарам народных школ Ваўкавыскага павета, потым настаўнікам і дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі, адным з кіраўнікоў Таварыства беларускай школы.

У пачатку 1937 года Сяргей Паўловіч прыязджае ў Варшаву. У газеце праваслаўнай мітраполіі „Слово” ён дамаўляецца наконт выдання беларускага дзіцячага часопіса „Снапок”. Ідэю такую супрацоўнікі „Слова” падтрымліваюць. І Сяргей Паўловіч узяўся за працу. Ён зняў для пражывання ў Варшаве кватэру і кожны дзень прыходзіў на працу ў рэдакцыю „Слова”. А 1 траўня 1937 года з друку выйшаў першы нумар часопіса. Свае карэспандэнцыі чытачы маглі прысылаць не толькі на варшаўскі адрас часопіса, але і на віленскі хатні адрас Паўловіча: Папоўская вуліца, 9, кв. 4. На часопіс адразу была адкрыта падпіска. Яе прымалі і ў Варшаве ў рэдакцыі „Слова”, і ў Вільні ў кнігарні „Пагоня”.

Часопіс „Снапок” поўнасцю рабіў сам Сяргей Паўловіч. Ён пісаў многія рэлігійныя творы, артыкулы пра асветнікаў Кірылу і Мяфодзія, Ефрасінню Полацкую, трох віленскіх мучанікаў, архітэктурныя помнікі Беларусі, перадавыя артыкулы пра народныя і рэлігійныя святы, сам падбіраў творы беларускіх пісьменнікаў. На старонках „Снапка” друкаваліся артыкулы пад рубрыкай „Усячына”, дзе паведамляліся звесткі з галіны геаграфіі, біялогіі, іншых навук.

У часопісе шырока былі прадстаўлены асноўныя жанры беларускага фальклору. Гэта былі народныя песні, казкі, прымаўкі, загадкі, якія прапаноўваў у часопіс Рыгор Шырма. Актыўна друкаваліся ў „Снапку” творы для дзяцей Максіма Танка, Міхася Васілька, Ніны Тарас, Міхася Машары, Алеся Дубровіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Янкі Журбы, Альберта Паўловіча, байкі Янкі Быліны, перакладзеныя на родную мову творы Міхаіла Лермантава, Фёдара Цютчава, Генрыка Сянкевіча і іншых пісьменнікаў.

Сваім выданнем Сяргей Паўловіч намагаўся выхаваць у беларускіх дзетак пачуццё прыналежнасці да свайго народа, які размаўляе на роднай мове. Рэдактар праз часопіс імкнуўся пашырыць асвету на беларускай мове, садзейнічаў фармаванню дэмакратычных поглядаў, абуджаў нацыянальную свядомасць у дзяцей і іх бацькоў, далучаў юных чытачоў да скарбніцы нацыянальнай і сусветнай культуры. І гэта яму ўдавалася. Разнастайнасць матэрыялаў, добрыя пераклады сусветнай літаратуры, добры падбор беларускіх твораў спрычыніліся да таго, што „Снапок” з кожным нумарам станавіўся ўсё больш і больш папулярным. Ён рэгулярна выходзіў з траўня 1937 года да сакавіка 1938 года. Арсень Ліс памыліўся, калі напісаў у „Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” (Мінск 2001, т. 6, с. 371), што „Снапок” выходзіў да верасня 1939 года. З друку выйшла ўсяго 10 нумароў і ўжо сакавіцкі нумар за 1938 год да чытачоў не прыйшоў.

Прычыны, як пісалі тады некаторыя заходнебеларускія выданні, былі невядомыя. Але беларускі ўніяцкі часопіс „Злучэньне” № 6 за 1938 год паведаміў, што выдаваць „Снапок” забаранілі адміністрацыйныя ўлады.

Сяргей Паўловіч моцна перажываў, што забаранілі выдаваць яго любімы часопіс. Ён вярнуўся з Варшавы ў Вільню і ў верасні 1940 года памёр ад інфаркту.

Сяргей ЧЫГРЫН

Вачыма еўрапейца

Што з тою Картай?

Крыху здзівіў мяне польскі пасол у Мінску Генрык Літвін. Вось у час І Польска-Беларускага эканамічнага саміту ў Варшаве я спытаўся ў яго, колькі да гэтага часу Карт паляка выдалі польскія консульскія ўстановы ў Беларусі (размова з паслом Літвінам у гэтым нумары „Нівы” на стар. 5). З гэтак званага ходу спадар пасол не ўмеў адказаць на гэтае пытанне. Гэта дзіўна, бо я хацеў, каб прагучаў толькі агульны лік, асабліва ў час мерапрыемства, на якім, як думаю, пан пасол мог спядзявацца, што такое пытанне можа быць пастаўлена. Пасля вяртання з саміту я рашыў не адпусціць і „ніўскімі” каналамі даведацца, як маецца справа з тою Картай паляка, якая, згодна з адпаведным законам, які ўвайшоў у сілу пры канцы сакавіка 2008 г., пацвярджае прыналежнасць да польскага народа. Удалося без ніякіх праблем. Адпаведныя інфармацыі дэпартамент супрацоўніцтва з Палёніяй МЗС мае апрацаваныя на некалькіх старонках. Падрыхтаваны гэты матэрыял для патрэб сеймавай камісіі лучнасці з палякамі за мяжой. Гаворка ў ім аб стане справы на канец сёлетняга красавіка. Сёння, калі паказаўся гэты нумар „Нівы”, некаторыя лікі крыху змяніліся, але агульны вобраз падобны.

Агулам уручана ўжо фізічна больш за 15 тысяч Карт, а на амаль 26 тысяч заяў пазітыўнае рашэнне дадзена было ў 99 працэнтах; адкінута была 131 заява. У матэрыяле для сеймавай камісіі можна прачытаць: „Галоўныя прычыны адмоўных рашэнняў гэта няведанне польскай мовы ды прадпасылкі вынікаючыя з 19 артыкула 3 пункта (рэпатрыяцыя з тэрыторыі Польшчы на падставе адпаведных рэпатрыяцыйных дамоў)”. Вядома, як можна было спадзявацца, найбольш заяў было пададзеных і найбольш Карт было выдадзеных у Беларусі і Украіне. І так у польскім консульскім аддзеле ў Мінску рашэнне аб Карце паляка было выдадзена ў 1 221 выпадку, у консульстве ў Брэсце — 1 733, а ў Гродне — 4 050. Па адной заяве адкінулі ў Мінску і Гродне, сем у Брэсце і тут адзінаццаць Карт было ануляваных. Для параўнання: у Львове рашэнне аб прысваенні Карты выдалі для 11 566, у Кіеве — для 1 616, а ў Вільні — для 1 203 асоб.

Як вынікае з інфармацыі МЗС, найбольш праблем з рэалізацыяй закону аб Карце паляка выступае якраз у Беларусі. У матэрыяле гэтага ведамства чытаем: „Цяпер гэта з'яўляецца другой па важнасці спрэчнай праблемай з гэтай краінай (пасля склаўшайся сітуацыі з Саюзам палякаў Беларусі), якая выносіцца беларускім бокам пры кожнай нагодзе”. І далей: „Улады Беларусі ад пачатку былі супраць рэалізацыі закону на яе тэрыторыі, успрымаючы гэта як элемент умяшальніцтва ва ўнутраныя справы Беларусі і фактар, які падрывае еднасць беларускага народа. Намякаюць прытым, што закон аб Карце паляка нязгодны з міжнароднымі стандартамі і што, выдаючы Карту паляка, консул дае дакумент чужаземцу іншы, чым гэта прадбачваюць Венская консульская канвенцыя і двухбаковая консульская дамова [у гэтым выпадку беларускі бок мае рацыю — М. Х.]. Гэтыя абгрунтаванні знаходзяць адбітак у канкрэтных дзеяннях, якія праяўляюцца м.інш. у нявыдачы віз польскім консулам, маючым рэалізаваць заданні звязаныя з Картай паляка”. У сувязі з такой атмасферай ды — што адзначае МЗС — маніторынгам у шырокім дыяпазоне асоб, якія атрымалі Карту або хадайнічаюць за яе, прадбачваецца паніжэнне ліку асоб, стараючыхся яе атрымаць. Тут якраз аргументацыя ведамства замежных спраў можа здавацца быць нятрапнай, паколькі прадбачвае, што ўсе палякі ў Беларусі намерваюцца выступаць за такую Карту.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Перасяклі местачковыя ўзроўні

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

— Гэта былі самыя лепшыя дні ў нашым жыцці, — сказала Тацяна Бабей, рэжысёр-пастаноўшчык узорнага тэатра пры гімназіі № 10 у Маладзечне. За момант словы пані Тацяны апраўдае паэтычна-музычны спектакль пра жыццё і творчы шлях Яна Тарасевіча „На крыллях музыкі". Узрушаная і захопленая публіка ўзнагародзіць іх бурнымі апладысментамі, стоячы.

Але справа ў іншых поспехах…

Саколка, 27 чэрвеня, субота. Перад уваходам у памяшканне Сакольскага стараства, дзе за хвіліну адбудзецца канферэнцыя, прысвечаная праекту „Ян Тарасевіч, вядомы і невядомы кампазітар памежжа", вялікая фотавыстаўка, якая паказвае ўсё, што адбылося на працягу папярэдніх 12 дзён у Саколцы. А адбыўся тут, можна сказаць, цуд. Упершыню, пасля 1920 года, мясцовая польская грамадскасць, паказала… што беларускасць для іх таксама свая. Як свая асоба Яна Тарасевіча, якую немагчыма адназначна прыпісаць да польскай ці беларускай грамадскасці. Жыхары Саколкі, па сваёй ініцыятыве, прысвоілі ўжо яго прозвішча новай вуліцы ў горадзе.

Тацяна Бабей, рэжысёр п'есы „На крыллях музыкі"

Зараз сакольская моладзь, пад кірункам спецыялістаў з Беларусі, развучыла беларускія песні (і, здаецца, не мела б яна канкурэнцыі на аглядах БГКТ), а беларуская — польскія. Праўда, усюды культурныя вартасці выспяваюць звыш дзяржаўных межаў і падзелаў, аднак у нас такая праўда не зусім зразумелая. Так як слова „культура" не заўсёды значыць культура. Часта пад такой шыльдай красуецца нейкае саломапляценне або спажыванне кілаграмаў бульбяной кішкі пад гучны рогат і задавальненне публікі. Мала каму патрэбная праўда, што культура і пераказ ідэі нараджаецца ў поце і крыві ейных творцаў, часта, як у выпадку Яна Тарасевіча, забытых і ўтаптаных у зямлю яшчэ пры жыцці. Рэфлексія прыходзіць пасля гадоў, калі сутыкаемся з крыніцамі — спадчынай. Музыка Яна Тарасевіча не толькі падабалася ліцэістам, можна сказаць што паказала ім новую перспектыву — эстэтыку, якая сама сабой мацуе дух сяброўства, адкрывае на чалавека, вучыць спачування, талерантнасці… Гэта было відаць па іх жывой рэакцыі на чорныя навіны…

Паэтычна-музычны спектакль „На крыллях музыкі", які меў сваю першую пастаноўку ў кінатэатры „Сокал" (27.06.2009), стаў падзеяй найперш для людзей зацікаўленых сваёй малой айчынай. А зышлося іх не так мала — ды ў кожным узросце.

Сюжэт п'есы мае музычна-біяграфічны характар. Праўда, звесткі пра жыццё кампазітара, у многім фантастычныя, паколькі ў самой Саколцы намножылася шмат міфаў і легендаў на тэму кампазітара. Адна з іх такая, што маэстра Віктар Скарабагатаў, які заслужыўся у адкрыцці прозвішча… унук кампазітара?!

Аўтарка сцэнарыя Галіна Дрокіна шмат увагі адводзіць атмасферы, у якой выспяваў і фармаваўся талент музыканта. Такім чынам знаёмімся з эстэтыкай пецярбургскіх кансерваторый і літаратурных салонаў, якія свету далі Чайкоўскага, Рахманінава, Глазунова, Маякоўскага, Салагуба, Багдановіча, Купалу. Іх паслядоўнікам стане наш герой. У будучыні перадасць ён ідэю свайму вучню, знакамітаму Ежы Максымюку.. Сустрэчы людзей культуры нярэдка ахінае драматычны вецер гісторыі. Цікава, што мова спектакля прымеркаваная да маладога пакалення г.зв. глабальнай вёскі.

І вядома, першую і асноўную ролю іграе тут музыка. Яшчэ па сённяшні дзень у маёй галаве гучаць фрагменты пачутых мелодый (пераважна ў аўтарскіх аранжыроўках), спалучаных з танцам або са словам. Як пластычна атрымалася мазурка ці вакальнае выступленне Матэвуша Геніюша („Што вы хлопцы пахмурнелі"). Побач твораў Пушкіна, Элюара выступіў і наш Віктар Швед (прагучэў ягоны верш, напісаны і зачытаны над магілай у 40-ю гадавіну смерці Яна Тарасевіча).

„Што вы хлопцы пахмурнелі" (злева) Матэвуш Геніюш

— Наш тэатр мае званне ўзорнага, — кажа Тацяна Бабей, — значыць, мы можам наш рэпертуар паказваць у якасці прыкладу для іншых школ і цэнтраў. Наш спектакль не закончыць свайго жыцця пасля сённяшняга выступлення. Мы хочам паказаць яго па ўсёй Беларусі.

Паколькі ў Саколцы спектакль паставілі на трох мовах: рускай, польскай і беларускай, мы пацікавіліся моўным пытаннем. Яшчэ да спектакля настаўнікі сказалі мне, што іхнія акцёры схіляліся ў бок беларускай мовы…

— Вядома, у Беларусі мы будзем паказваць спектакль на беларускай мове, — кажа Тацяна Бабей.

У гэтым месцы трэба назваць прозвішчы настаўнікаў з Беларусі: Тацяна Бабей, Галіна Дрокіна, Тацяна Мурышына, Аксана Посах (харэограф), Святлана Кісялёва. На спектакль прыехаў таксама дырэктар Маладзечанскай гімназіі № 10 Аляксандр Бурдыка, які сказаў:

— За гэтыя 12 дзён мы разам дасягнулі больш, чым за 20 гадоў нашага супрацоўніцтва з партнёрамі ў Нямеччыне. Наш праект перарос местачковы ўзровень і мы будзем рабіць усё, каб паказаць яго на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Саколка і Маладзечна крочаць у рытмах паланеза

У Саколцы пайшлі далей. Тут перараслі ўжо местачковыя і рэспубліканскія ўзроўні. Моладзь пачала ствараць сайт, прысвечаны Яну Тарасевічу **www.jantarasiewicz.org**. Пакуль ён на трох мовах: польскай, рускай і беларускай. Хоць сам праект дзейнічае ў рамках еўрасаюзнай праграмы „Маладыя ў дзеянні", шмат працы ўклалі тут настаўнікі: Анна Борыс (каардынатар праекта), Ірэна Шыманюк, Іаанна Пылко, Барбара Шчавінская, Яўгенія Гарбуз, Малгажата Кулакоўская. Настаўніцы, як і іх сяброўкі з Маладзечна, атрымалі еўрапейскія сертыфікаты. Ян Фірс, дырэктар ліцэя ў Саколцы, усе дзеянні па адкрыванні інфармацыі пра асобу і творчасць кампазітара з Саколкі падвёў такім чынам:

— Кожнага чалавека трэба памятаць, інакш мы не будзем здольны ў сваім жыцці рабіць добрую справу.

У Саколцы такую справу зрабілі польскія і беларускія настаўнікі сваім вучням.

Ян Фірс віншуе Анну Борыс, каардынатарку праекта

Старое Ляўкова

Сямейны пікнік

У апошнюю нядзелю мая ў Старым Ляўкове адбыўся сямейны пікнік, на які прыйшло шмат жыхароў Ляўкова, Лешукоў, Міхнаўкі, Ахрымоў і іншых вёсак. Найперш наведалі яны мясцовы асяродак здароўя, у якім прымалі лекар Пётр Ханецкі ды медсястра Алімпія Павільч (рабіла яна перш-наперш праверку сэрца — электракардыяграму). Лекар-спецыяліст з Гайнаўкі і медсястра з Нараўкі прынялі ўсіх пацыентаў, нікому не адмовілі, а было іх шмат.

А гадзіне 13 пачалося забаўляльна-культурнае мерапрыемства ў амфітэатры — перш за ўсё для дзяцей. Гулялі з імі акцёры Пшэмэк і Людміла з Лялечнага тэатра з Беластока. У той самы час Томэк, Блажэй і Куба — члены Польскага аб'яднання медыцынскай выратавальнай службы абучалі ўсіх ахвотных дарослых таму, як прыйсці з перадлекарскай дапамогай гвалтоўна захварэўшаму або пацярпеўшаму ў дарожнай аварыі.

Каля гадзіны 14 набліжалася навальніца і мерапрыемства перанеслі ў святліцу. Тут адбыўся турнір з удзелам 11 сем'яў. Вядучыя прыдумалі рознага роду спаборніцтвы. Закончыліся яны каля 16 гадзіны. Пераможцам стала сям'я Рафала Харкевіча (здабыла яна найбольш ачкоў), якая апярэдзіла сем'і Караля Казакевіча, Аляксандры Ляшчынскай і Данеля Мірановіча, якія таксама былі ўзнагароджаны.

У тым часе быў салодкі пачастунак для ўсіх дзяцей і бацькоў. Знайшліся ахвотныя да спаборніцтва ў настольным тэнісе. Мерапрыемства закончылася вечарам дыскатэкай.

Пікнік вяла Галена-Марыёля Рэент (кіраўнік стараляўкоўскай святліцы). Ёй дапамагалі дзяўчаты Сара Крышпенюк, Крыстына Ляшчынская, Анна Каліноўская і Дамініка Бірыцкая — стажоркі ляўкоўскай бібліятэкі. Сямейны пікнік арганізавалі за фінансавыя сродкі Пасляакцэсійнай праграмы падтрымкі вясковых абшараў — Праграмы грамадскай інтэграцыі.

Гайнаўка

Цудоўны канцэрт

У нядзелю, 21 чэрвеня, пасля поўдня ў гарадскім амфітэатры ў Гайнаўцы выступіў з канцэртам Акадэмічны калектыў песні і танца Узброеных сіл Беларусі з Мінска пад кіраўніцтвам палкоўніка Уладзіміра Варапаева.

Выступы працягваліся дзве гадзіны. Шматлікая публіка не хацела адпусціць са сцэны знакамітых выканаўцаў папулярных рускіх і беларускіх песень, а таксама дынамічных і стройных танцораў. Як жа мілагучна прагучалі песні м.інш. „Цёмная ноч", „Малдаванка", „Ехаў я з Берліна", „Кацюша", „Касіў Ясь канюшыну", „Цячэ вада ў ярок", „Полька беларуская", „Купалінка", „Вочы чорныя", „Расцвіталі яблыні і грушы", „Калінка", „День победы". А якія прыгожыя і віхурыстыя былі танцы! Якія ў танцораў касцюмы!

Спявалі хор вайскоўцаў і салісты. У іх цудоўныя галасы і самае лепшае выкананне. Нічога дзіўнага, што ім прыйшлося яшчэ і яшчэ раз выконваць самыя любімыя песні па запатрабаванню.

За цудоўны канцэрт падзякавалі беларускім артыстам бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк і дырэктар Гайнаўскага дома культуры Андрэй Скепка. На канцэрце быў прысутны, між іншым, пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы Віктар Гайсёнак.

Ян ЦЕЛУШЭЦКІ

Якія еўрасаюзныя сродкі ідуць у нашы вёскі?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Ян Адамчук з Чыжоў радуецца, што з еўрасаюзнай дапамогай купіў сельскагаспадарчыя машыны

Пасля далучэння Польшчы да Еўрасаюза з'явілася магчымасць атрымліваць з еўрасаюзнага бюджэту непасрэдныя даплаты да апрацоўваных палёў і сродкі на мадэрнізацыю гаспадарак. Калі традыцыйныя гаспадары атрымліваюць у асноўным толькі даплаты да апрацоўванай зямлі або яшчэ карыстаюцца ўспамогай для нізкатаварных гаспадарак памерам прыблізна каля 5 тысяч злотых у год (прызначаюцца гэтыя грошы на 5 гадоў), дык буйныя земляробы пачалі карыстацца частковым фінансаваннем (найчасцей 50-працэнтным) будовы ці перабудовы абораў або закупкі сельскагаспадарчых машын. Апошнім часам сталі яны атрымліваць з еўрабюджэту дапамогу ў сотнях тысяч злотых, але прытым найчасцей бралі крэдыты і выдавалі на мадэрнізацыю гаспадарак таксама свае сотні тысяч злотых. Зразумела, гэта не пад сілу дробным гаспадарам, у якіх да 10 гектараў зямлі і якім цяжка адкласці грошы на інвестыцыі.

Спачатку больш прадпрымальныя гаспадары атрымлівалі дапамогу на свае інвестыцыі ў рамках праграмы „Сапард", але яе памер не быў такім вялікім. Цяпер у выглядзе еўрасаюзнай дапамогі могуць вярнуць нават да 300 тысяч злотых, выдаткаваных, напрыклад, на куплю сельскагаспадарчых машын, калі ўся інвестыцыя вартая пад 600 тысяч злотых. Аднак перад вялікай дапамогай прытарможвае сялян фактар, што спачатку ўсе грошы на інвестыцыі земляроб мусіць выдаткаваць „са сваёй кішэні". Толькі пасля кантроляў, калі абора ўжо збудаваная або купленыя машыны стаяць на панадворку, чыноўнікі вырашаюць ці гаспадар прытрымліваецца ўсіх дамоўленасцей і ці заслугоўвае, каб вярнуць яму 50% выдаткаваных сродкаў (да згаданых 300 тысяч злотых). Няўпэўненасць, ці ўзяўшы крэдыт вернуць палову яго вартасці, стрымлівае менш заможных гаспадароў хадайнічаць за большую еўрасаюзную дапамогу. У мінулых гадах тыя, што хацелі атрымаць большыя еўрасаюзныя грошы, мусілі днямі і начамі стаяць у чэргах перад выбранымі Агенцтвамі рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі, каб у адпаведны дзень падаць бізнеспланы развіцця сваіх гаспадарак і прашэнні на еўрасаюзную дапамогу. Цяпер памяняліся прынцыпы набору дакументаў на большую грашовую ўспамогу — з ліку пададзеных на працягу большай колькасці дзён прашэнняў шляхам жараб'ёўкі выбіраюцца тыя, якія разглядаюцца ў першую чаргу.

— Я быў у чарзе, недзе пад тыдзень часу, да моманту набору дакументаў на еўрасаюзную ўспамогу, але дзяжурыў толькі некалькі дзён, бо мы мяняліся і трымалі чаргу перад беластоцкім агенцтвам паводле вызначанага графіка, — заяўляе Ян Адамчук з Чыжоў, якога сын падаў дакументы ў мінулым годзе і яшчэ тады сямейнікі супольна купілі сельскагаспадарчыя машыны. — Трэба было сабраць многа дакументаў і напісаць бізнесплан нашай гаспадаркі. Пазней мы многа нервавaліся, бо зацягвалася падпісанне дамовы на вяртанне паловы ўкладзеных сродкаў, але што ж зробіш. Добра, што грошы дадуць. Я зараз пенсіянер і толькі дапамагаю свайму сыну Славаміру ў гаспадарцы.

Машыны былі куплены яшчэ ў мінулым годзе, а кантралёры пазней па-зітыўна ацанілі інвестыцыю, якая мае спрычыніцца да развіцця гаспадаркі спадарства Адамчукоў.

— Паколькі былі ў нас свае грошы і не трэба было браць крэдытаў, мы рашыліся купляць машыны нягледзячы на тое ці вернуць нам палову выдаткаваных сродкаў і выйгралі на гэтым. Мы прыдбалі ў выдатнай большасці машыны вытворчасці краін заходняй Еўропы, а тады яшчэ еўра каштавала каля 3,5 злотага. Тыя, якія рашыліся інвеставаць грошы з крэдытаў, чакалі ажно ўступна зацвердзяць іх бізнеспланы, і прайгралі на гэтым. Зараз еўра каштуе недзе 4,5 злотага і ўсе заходнія машыны намнога падаражэлі, — тлумачыць Ян Адамчук. — Рашыліся мы максімальна выкарыстаць еўрасаюзную ўспамогу і таму зрабілі пакупку на амаль 600 тысяч злотых.

Спадар Ян выводзіць мяне на панадворак паказаць купленыя машыны. Дом і панадворак спадарства Адамчукоў — вялікі на ім парадак, многа дэкаратыўных дрэў і прыгожай расліннасці — могуць быць візітнай картачкай Чыжоў.

— Мы хочам вымасціць брусчаткай-польбрукам вялікую частку панадворка і дзеля гэтага купілі ўжо асноўныя матэрыялы. Але трэба яшчэ многа папрацаваць, каб перабудаваць паверхню, — гаворыць Ян Адамчук, ідучы паміж вялікімі гаражамі і велізарным складам для збожжа. Сям'я Адамчукоў абрабляе пад 60 гектараў палёў і таму частку збожжа перахоўваюць яны ў сваім складзе. Раней выкарысталі дапамогу ў рамках праграмы „Сапард" і купілі сушылку для зерня, каб можна было яго сушыць пасля малацьбы ў неспрыяльных атмасферных умовах, і іншыя драбнейшыя машыны. Велізарны трактар, куплены ў мінулым годзе, робіць вялікае ўражанне.

— За гэты трактар нямецкай суполкі „John Deere" на 140 конскіх сіл заплацілі мы 312 тысяч злотых яшчэ пры танным еўра, а зараз заплацілі б за яго намнога больш. У гэтым трактары рысараваныя восі і добрыя ўмовы працы ў сучасна сканструяванай кабіне. Ёсць там і абагравание, і кандыцыянер, не гаворачы ўжо пра электронную тэхніку ці радыё. Купілі мы таксама дзве вялікія прычэпы па 50 тысяч злотых кожная, у якіх можна перавозіць па 8 тон збожжа. За пасяўны камбайн мы заплацілі 91 тысячу злотых, а ён настолькі добры, што адразу рыхтуе зямлю для пасеву, нават у тых месцах, дзе прыдушаць глебу колы трактара, высеявае зерне і пасля яго не трэба ўжо дадаткова заграбаць. 48 тысяч злотых заплацілі мы за вельмі добрыя французскія вярчальныя плугі, а 12,5 тысячы злотых — за раскідальнік мінеральных угнаенняў. Ажно 25 тысяч злотых каштавала ратацыйная барана з катком, які раскладаецца на 6 метраў ушыр і ёсць на ім нажы. Можна ім зварушыць зямлю перад пасевам і можна яе трамбаваць, — пералічвае спадар Адамчук. — Мае сыны гаспадараць не так, як мы рабілі раней, але стараюцца трымацца навейшых тэхналогій вырошчвання збожжа, што дазваляе атрымліваць ураджай пшаніцы нават пад 7 тон з гектара. Праўда, дзеля добрага плёну трэба выдаткаваць многа грошай на мінеральныя ўгнаенні і сродкі аховы раслін і таму ў агульным прыбытак з вырошчвання збожжа зараз атрымліваецца не такі ўжо вялікі. Зараз у нас 3 трактары — айчынны „Урсус С-330" служыць нам ужо больш дваццаці гадоў. Ёсць таксама свой збожжаўборачны камбайн, але ён ужо выпрацаваны. Мы хочам у бліжэйшым часе купіць новы камбайн.

Яўген Заброцкі са Збуча, які абрабляе каля 150 гектараў палёў, рашыўся таксама купіць новы збожжаўборачны камбайн з намерам атрымаць 50% выдаткаваных на куплю камбайна сродкаў з еўрасаюзнай дапамогі. У мінулым годзе стаяў ён у чарзе разам са спадаром Адамчуком. Не рашыўся выкарыстаць усёй еўрасаюзнай дапамогі, якую можна атрымаць у 2007-2013 гадах, але зможа гэта яшчэ зрабіць.

— Я чакаю кантралёраў, так што няма яшчэ ўпэўненасці, што гэтую ўспамогу атрымаю. Але сваё трэба было адстаяць у чарзе і выдаткаваць многа сваіх грошай, — кажа Яўген Заброцкі.

— Калі гаварыць пра нашых гаспадароў, дык адносна мала іх у мінулым годзе звярнулася за еўрасаюзнай дапамогай. Нас з Чыжоўскай гміны было двух, я і Яўген Заброцкі. Двух гаспадароў з Ягаднік звярнулася за такой самай дапамогай, адзін гаспадар з Пасынак і адзін гаспадар з Парцава, — расказвае Ян Адамчук. — У мінулым годзе многа гадоўцаў кароў рашылася браць крэдыты і выступаць за дапамогай, але зараз цана малака малаватая і некаторыя, што набралі крэдытаў, шкадуюцца.

Трэба толькі спадзявацца, што не будзе такіх, якія ўзялі крэдыты, інвеставалі, а па нейкіх прычынах не вернуць ім паловы выдаткаваных грошай.

Перад наступным крокам

Размова з Генрыкам Літвінам, паслом РП у Мінску

Фота Мацея Халадоўскага

„Ніва”: — ***Адкуль, у Вашай ацэнцы, прэтэнзіі прадпрымальнікаў наконт выдачы віз польскімі консульскімі ўстановамі ў Беларусі?***

Генрык Літвін: — Спасылаюцца яны на сітуацыю, якая існавала паўтара года таму і з першага тыдня функцыянавання ў Польшчы Шэнгенскай сістэмы, калі па сутнасці ўся электронная сістэма выдачы віз працавала яшчэ нядобра і сапраўды даходзіла да непаладак. Тады было ў нас многа адмоў. Заявы — як кажуць — адкідвала камп’ютарная сістэма. Аднак гэта працягвалася толькі каля двух тыдняў і ніколі пасля не паўтарылася. У даны момант візавых адмоў у нас столькі, як у сярэднім у Еўрасаюзе, а нават крыху менш. Ёсць адрозненні паміж хуткасцю выдачы віз у нашым консульстве і консульствах іншых еўрасаюзных краін. У, скажам, чэшскае консульства прыходзіць пятнаццаць, трыццаць, пяцьдзесят чалавек у дзень, а да нас — чатырыста. Праўда, у нас тры консульствы, але ў кожным нашмат больш наведвальнікаў, чым у адным з большасці еўрасаюзных краін. Консульскі аддзел у Мінску працуе ў гэты момант пастаянна, тады калі большасць іншых консульстваў краін ЕС прымае па спіску. Не бачым сябе на тым фоне аж так кепска. Рух паміж Беларуссю і Польшчай проста большы, чым паміж Беларуссю і іншымі еўрасаюзнымі краінамі. Бываюць, вось, час ад часу такія сітуацыі, што прыходзіцца крыху пачакаць візы. Гэта аднак не віна нашых консулаў, гэта вынікае з неабходнасці захоўвання абавязваючых у ЕС працэдур. Мабыць, бывае, што нашы калегі дазваляюць сабе час ад часу на парушанне гэтых працэдур, у параўнанні да консульскіх працаўнікоў краін больш умацаваных у Шэнген. Але мы заўсёды чакаем адказу электроннай сістэмы на пастаўленае пытанне. Консул, які пускае ў рух візавую працэдуру адразу, значыць, калі прынятыя заявы маюць быць уведзеныя ў сістэму, не мае ніякага ўплыву на хуткасць далейшага іх афармлення. Мусіць чакаць адказу на г.зв. візавы запыт. Ведаю выпадкі выпісання вельмі кароткатэрміновай візы прадстаўніку беларускай лакальнай адміністрацыі [гаворка аб аднадзённай візе выдадзенай брэсцкаму губернатару, які не змог у сувязі з гэтым удзельнічаць у цэласці мерапрыемства ў Польшчы, на якое быў запрошаны — М. Х.]. Такія выпадкі здараюцца ў рамках свайго роду ўзаемнасці. Час ад часу бываюць рашэнні менш прыязныя, але гэта не прынцып. Генеральным прынцыпам цяпер з’яўляецца максімальнае адкрыццё на патрэбы нашых гасцей, асоб, якія хочуць наведаць Польшчу. Норма, актуальна прынятая ў польскім МЗС, такая: каб у межах правіл, працэдуры, віза была максімальна „выгадная”, значыць, максімальна доўгатэрміновая і як толькі ўдасца — шматразовая. Мы ў Шэнгенскай зоне — новая краіна і на працягу апошняга паўгоддзя вучымся выкарыстоўваць магчымасці гэтай сістэмы шараг больш прыязна.

— ***А канкрэтна, колькі сёлета віз ужо выдалі польскія консульскія ўстановы ў Беларусі?***

— Па памяці вам канкрэтна не скажу. Напэўна гэта ўсё ж менш, чым у 2007 годзе [гаворка пра перыяд зараз перад уваходам Польшчы ў Шэнгенскую зону — М. Х.]. Хоць здараюцца перыяды, калі абцяжаранне параўнальнае. У першыя тыдні лета консульства ў Мінску, якое я ведаю найлепш, прымае візавыя заявы ад чатырохсот-пяцісот асоб удзень. Гэта параўнальнае да кульмінацыйнага абцяжарання ў 2007 г. Варта тут сказаць, што таксама грамадзяне Беларусі прывыклі ўжо да шэнгенскага рэжыму. Наколькі ў першым годзе яго дзейснасці меў ён знеахвочваючы ўплыў на замежныя падарожжы беларусаў, у гэты момант гэта ўжо шараг больш мяняецца. Беларусы навучыліся карыстацца магчымасцямі, шэнгенская сістэма нясе таксама каштоўнасці, а не толькі абцяжаранні.

— ***Колькі Карт паляка да гэтага часу выдалі ў Беларусі?***

— Няма ў мяне такой інфармацыі. Мы прынялі прынцып, што ніякіх гонак не будзе, калі гаворка пра іх лік. Працэдура выдачы Карт паляка досыць складаная, патрабуе збору адпаведных дакументаў, двухразовай сустрэчы з консулам. А гэта адбываецца са спакоем і цярплівасцю ў нашых консульствах, у якіх, дарэчы, няма вельмі добрых кадравых магчымасцей. Працуем у такім самым кадравым саставе, як да ўступлення ў сілу закону аб Карце паляка.

— ***Калі, у Вашай ацэнцы, пачне абавязваць дамова аб малым памежным руху, падпісанне якой зацягваецца вельмі доўга? Прэм’ер Туск у час саміту ўспамінаў аб двух месяцах, прадстаўнікі афіцыйнага беларускага боку сказалі мне пра канец гэтага года.***

— Былі перыяды прытармажэння на нашым баку, а пасля таксама па другім. Апошнія цяжкасці, якія былі магчымыя для пераадолення, вынікалі з рознага падыходу да некаторых пытанняў...

— ***Якіх?***

— Хоць бы справы страховак здароўя. Такіх, якія не маюць ніякай палітычнай падаплёкі, а вынікаюць з адрозненняў у мясцовым законе, нейкай філасофіі дзеянняў у канкрэтных сферах. У прынцыповых пытаннях мы паладзіліся, асабліва таму, што мелі мы ўжо вопыт у гэтых справах з Украінай...

— ***Значыць — калі?***

— Не ведаю. Так, як сказаў прэм’ер: гэта справа тыдняў. Прашу толькі памятаць аб тым, што прэм’ер гаварыў аб падпісанні дамовы, а калі гаворка пра канец года, трэба мець на думцы ўступленне дамовы ў сілу. Абодва бакі маюць у гэтай справе падобнае ўяўленне. Прытым падпісанне дамовы гэта пытанне таксама палітычнай натуры. Хацелася б, каб гэта было ўчынена на адпаведным узроўні. Падпісанне такой дамовы на высокім узроўні не можа быць адзінай тэмай сустрэчы.

— ***Ці г.зв. дыпламатычныя крыніцы ведаюць чаму — незалежна ад прадбачанняў арганізатараў саміту, значыць, галоўным чынам Польска-беларускай прамыслова-гандлёвай палаты — не быў на ім прысутны прэм’ер Сяргей Сідорскі?***

— Сустрэча прэм’ераў не з’яўляецца дзеяннем от такім сабе. Гэта сур’ёзная падзея ў двухбаковых адносінах і мусіць быць усебакова падрыхтаванай, асабліва калі гаворка пра асобы, з якімі маем дачыненне, значыць, прэм’ерамі патрабуючымі фактаў. Прэм’ер Туск, у якога вы спыталіся, сказаў, што да такой сустрэчы дойдзе, калі з гэтай праблемай справяцца МЗСы (мабыць, можна было б дадаць яшчэ пару іншых ведамстваў). А што гэтае выказванне прэм’ера значыла? Тое, што такое спатканне мусіць мець раней падрыхтаваны змест.

— ***Наколькі памятаю, яшчэ ў верасні мінулага года шэф польскага МЗС Радаслаў Сікорскі сустрэўся з міністрам замежных спраў Беларусі Сяргеем Мартынавым. У лютым сёлета дайшло да сустрэчы ў Мінску віцэ-прэм’ера Паўляка з прэм’ерам Сяргеем Сідорскім. Ад таго часу немагчыма было, як гэта кажаце, падрыхтаваць змест сустрэчы прэм’ераў?***

— Як шмат асоб паўтарала на саміце, працэс звязаны з польска-беларускімі адносінамі — цяжкі. Ёсць недамоўленыя справы. На пераадоленне гэтых цяжкасцей неабходна крыху часу. Паколькі саміт праводзіўся ў Польшчы, наведаў яго прэм’ер Туск і размаўляў з віцэ-прэм’ерам Андрэем Кабяковым. Так сама было ў час візіту віцэ-прэм’ера Паўляка ў Мінску, калі сустрэўся ён з прэм’ерам Сідорскім. Цяпер рыхтуем наступныя крокі.

— ***Дзякуем за размову.***

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Размова была праведзена 24 чэрвеня ў час І Польска-Беларускага эканамічнага саміту, у якім удзельнічалі таксама пасол Генрык Літвін і пасол РБ у Польшчы Віктар Гайсёнак.

За вяртанне да сумленных прынцыпаў

Ці памятаеце як калісьці ў нашых вёсках пачалі з’яўляцца крамы, школы, пункты скупкі малака ці іншыя аб’екты публічнага ўжытку? Спярша была чыясьці ініцыятыва, а доказам шырокай для яе падтрымкі быў удзел мясцовай грамадскасці ў яе ажыццяўленні. Людзі працавалі, не шкадуючы сваіх сіл, ахвяроўвалі грошы ці элементы абсталявання. А яшчэ раней хтосьці адводзіў для гэтай мэты кавалак зямлі, на якой узводзілася будоўля. Дзяржава часам давала трохі грошай, аднак найчасцей фінансавала толькі план будовы і ласкава прызначала заўсёдна тады дэфіцытныя будаўнічыя матэрыялы. Але галоўную матэрыяльную нагрузку неслі жыхары дадзенай вёскі і навакольля. На жаль, пасля завяршэння пабудовы аб’ект перадаваўся ў карыстанне адпаведнай арганізацыі, якая адкрывала і вяла дзейнасць крамы, школы ці паслуговага пункта. І ў гэты момант заканчвалася юрыдычная сувязь мясцовага насельніцтва з пабудаванай „на грамадскіх пачатках” школай, крамай і т.п. Законы былі такія, што ўладальнікамі станавіліся кураторыя (казна), гмінны ці малочны кааператывы. І такі стан рэчаў працягваўся аж да закрыцця дадзенай вясковай установы і яе ліквідацыі ў апошнім дваццацігоддзі, калі раптоўна нерэнтабельнымі сталі крамы, пункты скупкі малака, адукацыя вясковага насельніцтва ці медыцынская апека над ім. Хваля вялікага распродажу нацыянальнай маёмасці дакацілася і да нашых вёсак. Пад узнёслым лозунгам „прыватызацыі” за марныя капейкі дастаюцца ў чужыя рукі нашы школы, крамы, пункты скупкі малака ці амбулаторыі. Мясцовая грамадскасць ад гэтага нічога не мае: ні дадзенай установы, ні атрыманых за яе грошай.

Думаю, што такая практыка — неадпаведная і несумленная. Па-мойму, кожны ўзведзены намаганнямі насельніцтва аб’ект публічнага ўжытку павінен быць уласнасцю тых, хто яго ўзводзіў, ахвяраваў зямлю, будматэрыялы, працу. Адносна невялікі ўдзел у будову дзяржаўнага боку трэба было б прызнаць амартызаваным у выніку эксплуатацыі аб’екта. І з хвілінай ліквідацыі такой установы яе матэрыяльная кампаненты (будынкі, участак) павінны безумоўна вярнуцца ва ўладанне лакальнай грамадскасці. Хай жыхары вёскі вырашаюць аб далейшых лёсах аб’екта: прадаць яго ці не. Калі так, то каму і за колькі; калі не — то знесці яго ці перадаць у дармовае карыстанне, напрыклад, узамен за некалькі працоўных месц для жыхароў вёскі. І гэтак далей. У самым горшым выпадку трэба вярнуць ахвяраваны ўчастак (нават з забудовай) яго гаспадару або нашчадкам. А гміна, уладары якой найчасцей забываюць аб сваёй службовай ролі ў адносінах да грамадства, мела б у абавязку дапамагчы знайсці адпаведнага пакупніка ці карыстальніка. Калі б гэты прынцып прымяніць да сакральных аб’ектаў, то, мабыць, хутка скончылася б перахопліванне мацнейшымі рэлігійнымі абшчынамі храмаў і могільнікаў. Але перш за ўсё быў бы гэта першы крок да сумленнасці ў грамадскіх адносінах, а тым самым — набліжэнне да нармальнасці, якой нам так вельмі яшчэ не хапае.

М. Ц.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Летнік па-пушчанску

— Станьце паводле росту... А цяпер дзелімся паводле росту, вышэйшыя будуць веліканамі, а ніжэйшыя гномамі.

— Ооооо??? Чаму так...

— Такія прынцыпы гульні. А зараз прыдумайце правы для гномаў, як для меншасці. Гномы таксама думаюць пра правы для сябе.

Так пачыналася адна з гульняў у час восьмага ўжо летніка, які прайшоў у Тэрэмісках з 28 чэрвеня па 4 ліпеня гг. Чатырнаццаць маладых людзей, з шостага класа па ліцэй, ужо з першага дня пачалі пазнаваць прыгажосць Белавежскай пушчы (сябе ўжо больш-менш ведалі з ранейшых праектаў ці летнікаў). Каб не было гэта так неразумна, у гісторыю і магію пушчанскага жыцця нашу моладзь увёў Анджэй Кэчынскі, спецыяліст па пушчанскіх цікавінках. Тры дні пазней прыроду нацыянальнага парку дзеці адчувалі на сабе з дапамогай экскурсавода Пятра Карпюка. З усім паспелі справіцца дзякуючы роварам, якія сталі асноўным сродкам транспарту і кожны раз паспяхова давозілі групу ў Белавежу і яе наваколле.

У гарачыя і парныя дні ўсе карысталіся халодным памяшканнем Усеагульнага ўніверсітэта імя Я. Ю. Ліпскага, дзе і жылі на працягу тыдня. А там раскрывалі ўсе свае таленты: музычныя, вакальныя, акцёрскія, асабліва ў час падрыхтоўкі спекталя „Калхоз", які прэзентавалі на канец летніка сваім бацькам ды ўсім тым, якія пацікавіліся плакатам на дзвярах крамы ў Тэрэмісках і аб'явамі ў інтэрнэце. Дзеля спектакля дзеці ўзгадалі сабе „Цацачную краму" Леаніда Дранько-Майсюка і яе варыянт ад Зміцера Вайцюшкевіча, але дзякуючы ўсім заняткам прыдуманы быў зусім новы варыянт добра вядомых твораў. А творчых момантаў было больш.

— Тым, якія маюць найбольш пунктаў, загадваем выканаць песню і тады можаце далучыцца да нашай групы.

— Але мы не хочам.

— Як не хочаце? Мусіце! — крыкнула група, якая трымала ўладу... зразумела, толькі ў час гульні. Па-за гульнёю атмасфера ў час летніка была зусім дэмакратычная, усе пароўну прыбіралі, рыхтавалі ежу і прымалі ўдзел у занятках. Гулялі ў сваю ўлюбёную хусту, задумваліся над карцінай „Люблінская ўнія" Яна Матэйкі ці пазнавалі смак мясцовай кухні пад вокам спадарыні Марыі Нічыпарук з агратурыстычнай гаспадаркі Сяло Буды. Дзякуючы апавяданням „белавежцаў", даведаліся яны пра цікавыя пушчанскія месцы, а дзякуючы расказам Міхася Андрасюка — пра клопаты з польска-савецкай мяжой у пушчы. Усімі атракцыёнамі цяпер цешацца малодшыя, бо да бліжэйшай суботы ў Тэрэмісках гасцюе дзевяты ўжо летнік, у гэты раз для вучняў пачатковых школ.

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Музыка з кайфам

У купальскую ноч

Вянкі, Купалле, Ноч Купалы і пэўна яшчэ іншыя назвы прымяняюцца для названня адзінай такой ночы ў годзе. У нашым выпадку нават дзвюх, бо купальскія мерапрыемствы ладзяцца ў нас паводле календара новага і старога стыляў. Пачынаюцца яны недзе з 20 чэрвеня і працягваюцца нават даўжэй за палову ліпеня. І хаця самымі важнымі стыхіямі ў гэтую ноч з'яўляюцца вада і агонь, то зараз без музыкі ўжо ніводнае Купалле не мела б сэнсу.

— Такі дождж, кепскае надвор'е, можа не паедзем у Белавежу на гэтае Купалле, — расказваў мне пра сямейнае планаванне адзін з яго ўдзельнікаў. — Можа давайце паедзем пазней у Дубічы-Царкоўныя...

Мой суразмоўца гляну ў інтэрнэт:

— Украіна, Украіна, Украіна...Чаго мне туды ехаць, хачу паслухаць сваіх гуртоў, па-беларуску!

Такім чынам паехаў у Белавежу, дзе і мы сустрэліся. Пачатак. „Купалінка" і карагод у напрамку сцэны. Без „Купалінкі" няма Купалля. Так святкуецца ў Белавежы, Нараўцы, Залуках і ў іншых вёсках. Калісь з БАСам ладзілі мы купальскія сустрэчы ў Супраслі і тады таксама не ўяўлялі сабе свята без „Купалінкі".

Фота Міры ЛУКШЫ

У час кожнага выканання гэтага незвычайнага гімна сёлета ў Белавежы перад сцэнай стралялі феерверкі. Без гэтага зараз не адбудзецца ніводны вялікі канцэрт, асабліва на Купалле, калі належным чынам ацэньваецца моц агню. Тады феерверкі так можа і не перашкаджаюць, хаця найлепш было б, калі б была магчымасць скакаць праз сапраўднае вогнішча. Тым і заахвочвалі арганізатары беларускага Купалля ў Варшаве. Так, у Варшаве! Гэта здаецца адзінае сёлетняе Купалле, якое прайшло дакладна ў Купальскую ноч з 6 на 7 ліпеня. Пляценне вянкоў, скокі праз вогнішча, гульні, танцы, а ўсё не пры фальклорнай музыцы, толькі пры прагрэсіў, мінімаль ці дайнтэмпа ў выкананні дыджэя Алеся Кайтэка. Думаеце, што на беразе Вісты таксама можна знайсці папараць-кветку? Можа і можна, але без „Купалінкі", здаецца, гэта немагчыма. Варта, аднак, таксама ведаць, што „Купалінка" гэта не адзіная песня, якая паўстала для Купалля. Зараз большасць фольк- ці рок-выканаўцаў такую песню спявае. Ёсць нават інструментальны варыянт купальскай песні ад гітарыста „Крамы" і „Палаца" Сяржука Трухановіча. Тады можа і вы прыдумаеце сваю купальскую песню?

i_basovka@o2.pl

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Начная сустрэча з птушачкай

Калі ў першую ноч Сустрэч „Зоркі” сядзела я ў пакоі, раптам пачула голас. Што гэта за спеў? Я адчыніла акно і ў святле месяца пабачыла каляровую птушку. У яе была чырвоная дзюбка, жоўтыя ножкі. Мяне захапіла разнаколернае доўгае пер’е на крыллях. Птушка спявала ўсё галасней і галасней. Спачатку мне стала страшнавата. Я аднак пераадолела страх і яшчэ шырэй расчыніла акно. Я ведала, што сустрэла таленавітага спевака. Мне хацелася сфатаграфаваць маю незвычайную птушачку. Але пакуль я знайшла сяброўчын фотаапарат, яна адляцела. Мне стала сумна і, думаючы пра ўсё, што здарылася, я... заснула.

Раніцай я хацела расказаць сябрам пра сваю птушку. Раптам я ўсведаміла сабе ці сапраўды... я яе ўбачыла. А можа яна мне прыснілася.

„Павуцінне”,
Аня Келбашэўская
(Гімназія ў Нарве)

Але, здарылася так, што Шарлотка — пераехала. У іншы горад, у іншую мясцовасць. І для Сержыка — адразу паменшала залатых зорак у начным небе, жоўтых кветак у чыстым полі, іскрыстых пульсацый у юначым развярэджаным сэрцы!..

Праўда, на шчасце (аднак, ці на шчасце?..), побач заставалася яшчэ Кацечка. Кацечка, у якой таксама былі прыгожыя, вялікія вочы, няхай крыху і іншыя: разумныя, вабныя, запытальныя.

Вочы, у якія глыбока-глыбока зазірнуў Сяржук у апошняе спатканне. Так зазірнуў, што Кацечка раптам схапіла яго за руку, моцна сціснула і ціха спытала: „Што здарылася?”

Нічога не адказаў ёй Сяржук. Асцярожна забраў ён сваю руку і проста пайшоў, не азіраючыся. Здаецца, толькі нешта незаўважна змахнуў з вачэй, каб не замінала.

І кожны застаўся адзін.

Але! Плакаць не трэба; не трэба плакаць, шаноўныя вы мае. Прынамсі, у такой сітуацыі.

Ваш Дзядзечка Сід
18 чэрвеня 2009 г., Кобрын

ГАРАСКОП

Вадалей (21.01 — 19.02)

20 ліпеня не выходзь ноччу на панадворак, бо ў валасы можа ўплесціся кажан. Абыходзь кругом усіх бландзінак на школьным калідоры. Яны могуць паказацца дурнейшымі, чым ты думаў.

Шалі (24.09 — 23.10)

Не мыйся, бо страціш добры гумар. Каб забіць дзікі пах, купі за 2 зл. парфуму і апырсквайся ёй тры разы пасля кожнага харчавання.

Стралец (23.11 — 22.12)

Перажывеш непаўторную прыгоду на ўроках фізкультуры. Здалёк абыходзь катоў.

Рыбы (20.02 — 21.03)

Пазнаёмішся з новай сяброўкай, якая ў хуткім часе стане тваім ворагам. Купі сабе рыбак, гутарка з жыхарамі акварыума дапаможа справіцца з праблемамі.

Блізняты (22.05 — 22.06)

Сустрэнеш русакосага з зялёнымі вачыма. Сцеражыся кароў без калодак.

Скарпіён (24.10 — 22.11)

Дастанеш па галаве адбіўной катлеткай у школьнай сталовай, будзь асцярожны і не еш.

Баран (22.03 — 20.04)

Чакаюць цябе кантрольныя. Еш часнок. Калі настаўніца пачуе смурод, яна ўпадзе і не будзе кантрольнай. Не дакранайся да электраправадоў, вялікае праўдападабенства, што паразіць цябе ток.

Дзева (24.08 — 23.09)

Сустрэнеш дзяўчыну ў падштаніках. 15 ліпеня сустрэнеш з’яву на могілках, лепш пайдзі ў музей.

Рак (23.06 — 23.07)

Убачыш скарпіёна, звярні ўвагу на настаўніка гісторыі. 10 ліпеня цябе пакусае сабака.

Леў (24.07 — 23.08)

Палюбіш школьную сталовую з-за старой кухаркі. На небе пабачыш форму бота. 21 ліпеня параза на фізкультуры, не скачы праз казла, бо можаш на ім ад’ехаць.

Казярог (23.12 — 20.01)

Набліжаецца час плачу і суму, нічога не рабі. Звяртай увагу на мурашак. Могуць цябе пакусаць.

Бык (21.04-21.05)

Абмінай зеленавокіх, яны нядобрасумленныя; не кідай мараў, бо яны і так здзейсняцца. Назірай за птушкамі, могуць накакаць на галаву.

„Павуцінне”, *Магдалена Панасюк*
(Белгімназія ў Гойнаўцы), ***Оля Сіманюк***
(Гімназія ў Чыжах)

Міра ЛУКША

Дубанос з Дубін

Грубадзюб, семкаед, —
што ж ён з’еў бы на абед? —
Грабалуск, ён — дубанос.
Хто пачостку тут прынёс?
Кветкі дуба, плод крушыны,
і чаромхі, і рабіны...
Вольха, лубін, бружмель, вішня...
Насякомыя ж не выйшлі?
Аж пагладзіўся па брушку!
У Дубінах яму не ўсушка!
І на гняздо не малое
ёсць пад выбар: грабы, хвоі,
дубы, грушы... Верасовы,
пырніковы ўсціл гатовы.
А фантазія якая
пры аздобе дробных яек:
фіялетавыя крупкі
на зялёненькіх шкарлупках!
А найбольш чым быў бы рад?
Мець у сто гектараў сад,
сад вішнёвы... Летні сад.
У садзе — лівень-вішняпад...

ГІСТОРЫЯ ПРА ЧОРНАЕ, ЗАЛАТОЕ І ВЕЧНАЕ

А яшчэ іншым разам бываюць такія простыя гісторыі, што хоць плач... Але! Плакаць не трэба; не трэба плакаць, шаноўныя вы мае. Прынамсі, у такой сітуацыі, як...

Аднак, проста і па парадку. Жыў на свеце хлопчык Сяржук. І былі дзве дзяўчынкі — Шарлотка і Кацечка. Шарлотка — белая дзяўчынка, залатая бландзіначка. І Кацечка — дзяўчыначка чорная, смалістая шатэнка.

А Сяржук — ён, дурненькі, не ведаў, хто яму падабаўся больш, каго болей упадабаць, каму аддаць перавагу. І таму — сустракаўся адразу з абедзвюма. Дакладней, па чарзе. То з Шарлоткаю, то з Кацярынкаю. І было яму з залатою бландзінкай Шарлоткай лёгка, смешна, шчымліва, узвышана. А з крыжовай шатэнкай Кацечкай — адчайна, сур’ёзна, прыцягальна, натхнёна.

Польска-беларуская крыжаванка № 28

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 22:

Пуп, ліст, вата, мост, космас, кантакт, граніца. Плакат, тон, пласт, маса, смак, тост, патрэба.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Ася Стоцкая, Юстына Тамашук, Марыёля Анішчук, Дагмара Крупа** з Дубін. Віншуем!



Нашы пенсіянеры ў Літве

Саюз пенсіянераў у Нараўцы кожнае лета арганізуе аднадзённыя краязнаўчыя экскурсіі. 8 чэрвеня г.г. нараўчанскія пенсіянеры паехалі ў літоўскі курорт Друскенікі. Гэты горад распаложаны ў адлегласці 48 кіламетраў ад польска-літоўскай мяжы і толькі 6 км ад Беларусі.

Абапал шашы экскурсанты бачылі літоўскую нізіну, вёскі і хутары. У параўнанні з польскім літоўскае сяло выглядае бядней. Драўляныя хаты старыя і нізкія, крытыя пачарнелым шыферам. Вакол хутароў не відна ніякай агароджы. Дзе-нідзе пасвяцца кароўка ці конік. Сям-там каля хаты аўтамабіль. Збожжа на полі слабенькае, рэдкае. Многа аблагоў зарастаючых кустамі. На шашы намнога менш аўтамашын, чым у Польшчы.

У Друскеніках нараўчане былі некалькі гадзін. Экскурсанты раздзяліліся на групы. Адна група на моталодцы плавала па Нёмане, другая хадзіла на водныя працэдуры ў аквапарк, а трэцяя знаёмілася з горадам, наведвала крамы. У Друскеніках вельмі прыгожа — многа зелені, вакол сасновы бор. Тут добра адпачываць.

Літоўскія грошы дарагія. За адзін літ трэба заплаціць 1 злот і 30 грошаў. Гарэлка даражэйшая чым у нас, бензін каштуе падобна як у Польшчы. Даражэйшае чым у нас марожанае. Дарагі праезд па Нёмане — 30 літаў ад асобы. Уражанне такое, што ў нас жыццё таннейшае. У крамах з прадаўцамі можна дагаварыцца папольску або па-руску. Рускамоўныя літоўцы разумеюць па-беларуску.

Адвячоркам нараўчане вярталіся назад і ў 10 гадзін вечара былі ўжо дома. З Нараўкі ў Друскенікі амаль 250 кіламетраў, больш-менш як у Варшаву.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Аб'яднанне „Музей Малой Бацькаўшчыны" ў Студзіводах запрашае на V Падляшска-Палескія жніўныя сустрэчы

ОЛЕНЬ ПО БОРУ ХОДІТ

17 ліпень
Музей Малой Бацькаўшчыны ў Студзіводах
14.30 Карагод жняяроў на поле (*Старые Порубы*). Зажынкі
16.30 Жніўны канцэрт:
— „Жэмэрва" (Студзіводы)
— „Васілёчкі" (Бельск-Падляшскі)
— Калектыў з Дабрывады
— Трыо сёстраў Лук'яновіч (Леснікі, Драгічынскае Палессе)
— Лобчанка (Лобча, Лунінецкае Палессе)

18 ліпеня:
Музей Малой Бацькаўшчыны ў Студзіводах
15.00 Палескія вясельныя абрады ў выкананні калектыву з Лобчы
17.00 Аўтарскі вечар Надзеі Якавец з Лобчы ды Сяргея Алёнкіна з Рыгі

19 ліпеня:
Вёска Гамоты (Паўловічы), гм. Мельнік
15.00 Канцэрт беларускіх калектываў
— „Жэмэрва"
— „Малінкі"
— „Лобчанка"
— Трыо сёстраў Лук'яновіч

Нараўка бярэ размах

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Нараўка адзначала юбілей 370-годдзя; першая згадка пра мясцовасць паходзіць з 1639 года. 20 чэрвеня адбылося з гэтай нагоды адмысловае пасяджэнне Гміннай рады. У „звычайным" парадку дня было разгледжана пытанне пра вынікі кансультацый наконт змены назваў вёсак Лешукі і Гушчэвіна; жыхары гэтых мясцовасцей адмоўна аднесліся да праекту змен, бо ж гэта звычайны адно клопат. Ва „ўрачыстай" частцы пасяджэння даклад пра мінулае Нараўкі зачытаў вядомы беластоцкі гісторык, прафесар Адам Дабронскі. Званне ганаровага жыхара Нараўкі атрымаў вядомы нарваўскі бізнесмен Сяргей Мартынюк, які на месцы вытворчых памяшканняў былога нараўчанскага эскаэра, узведзеных калісь пакойным Канстанцінам Майсенем, збудаваў новыя цэхі для вырабу новай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Далейшае святкаванне круглавата-га юбілею гміннага цэнтра адбылося ў нядзельку, 28 чэрвеня. Быў гэта грандыёзны фэст, працягласцю за дзесяць гадзін. Гэты фэст адбываўся ў рамках праводзімай гмінай прамацыйнай кампаніі, на якую яна выхадайнічала мільён злотаў; сёлетні фэст быў пачаткам такой нізкі мерапрыемстваў, чарговыя адбудуцца ў чарговых гадах. Прамоцыя праводзіцца пад лозунгам „Зялёная краіна добрых вятроў" — першая частка адносіцца да Белавежскай пушчы, другая — да Семяноўскага вадаёма.

Як сказаў мне нараўчанскі войт Мікалай Павільч, прамоцыя гміны дае станоўчыя вынікі, гміна становіцца больш вядомай і прыцягвае зацікаўленне вонкавых наведвальнікаў і інвестараў. Тут характар капіталаўкладанняў крыху іншы чым у найбольш вядомай пушчанскай Белавежскай гміне. У Нараўчанскай гміне гатэляў яшчэ няшмат, але ўжо ёсць цікавыя праекты, м.інш. пабудова на Скупаўскай паляне, абведзенай кругом Белавежскай пушчай, адпачынковай вёскі, якая складалася б з комплексу асобных хат, якія маглі б наймаць вонкавыя турысты. Паблізу Семяноўскага вадасховішча, на непрыгодным для будаўніцтва ўчастку, прадбачваецца закладку гольфавага поля плошчаю ў амаль сорак гектараў. Праўда, інвестыцыйны разгон крыху прытармазіўся ў выніку цяперашняга эканамічнага застою, аднак жа ён не будзе доўжыцца бясконца і ў будучыні трэба спадзявацца новых інвестыцыйных ідэй і дзеля іх прыцягнення ў Нараўчанскую гміну трэба гэтай гмінай зацікавіць магчымых інвестараў, а круг іх цяпер шырокі — цэлы Еўрасаюз, і, здаецца, яшчэ больш.

Дзесяцігадзіннае нядзельнае мерапрыемства выпаўнілі выступленні разнародных музычных ансамбляў. Зоркай мерапрымства была вядомая польская эстрадная спявачка Юстына Стэчкоўская. Любіцеляў крыху даўнейшай музыкі забаўляў мясцовы нараўчанска-гайнаўскі гурт „Obraz kontrolny", які выканаў нізку гітаў з геркаўскай эпохі. Энтузіястаў музычных тэлеканалаў кшталту MTV ці VIVA павінен быў задаволіць гурт „Maraquja", якога салісткі стараліся паказаць свае ногі з усіх магчымых бакоў. А любіцеляў фальклору радаваў ансамбль народнай музыкі з горада Нежын, што ў Чарнігаўскай вобласці Украіны, у якім пражывае каля сямідзесяці пяці тысяч насельніцтва. Маладыя дзяўчаты школьнага ўзросту танцавалі, а больш масцітыя мастакі, якім ужо

Мерапрыемства адкрыў войт Мікалай Павільч

скакаць зацяжка, выканалі нізку папулярных у нас украінскіх песень.

Ансамблю з недалёкага замежжа хачу я прысвяціць крыху больш увагі, але не па мастацкіх, але па чыста чалавечых прычынах. Нашы госці з Усходу заўсёды паказваюцца мне вельмі добразычлівымі, але нежынскія мастакі гэтай рысай папросту захапілі мяне. Усялякіх добрых пажаданняў гледачам-слухачам была процьма, а гаспадарам мерапрыемства была процьма сувеніраў. У адзін момант здалося мне, што госці, калі б ведалі, колькі будзе ў Нараўцы гледачоў, сувеніры прывезлі б усім. (Удалося мне падслухаць выказванне адной панюсі: „Mówili, że będzie milion ludzi, a tu chyba i tysiąca nie ma".)

Прываліла мяне затое манера нашых чыноў. Яны ж, дзякуючы за падарункі, маглі б гаварыць на нейкай больш зразумелай гасцям з недалёкага замежжа мове. А яны, „ужэнднікі" нашы, аддзячылі сваім добрым гасцям чужым ім пшэканнем. Можна ж было тых слоў пару сказаць на мове сваіх бацейкаў ці мацярок, можна было нават загаварыць да іх на той трасянцы, на якой у нашых цэрквах прапаведуюць нашы прапаведнікі... Сарамнавата было і здаецца мне, што нараўчанскія радныя павінны чым хутчэй прыняць законнай у сваёй гміне дапаможную мову, каб чыны час ад часу загаварылі на ёй. Каб не кіраваліся „мудрасцямі" свайго „пана ўладзы" пра моўны „ciemnogród", але каб кіраваліся звычайнай чалавечай прыстойнасцю, якой спрыяюць актуальныя законы звышгміннага рангу.

Нараўчанскі юбілейны фэст адбыўся на тамашнім стадыёне. Арганізатары спадзяваліся большай колькасці народу, які ў традыцыйным месцы ладжання нараўчанскіх мерапрыемстваў, у амфітэатры над рэчкай, мог перакрыць праезд праз мост і закупорыць рух праз гмінны цэнтр. Да таго ж гукаўзмацняльная апаратура, неабходная для выступленняў музычных зорак, патрабавала больш прасторы. І тыя дынамікі давалі такі „чад", што ў начную пару нараўчанскі канцэрт можна было пачуць не толькі па ўсёй гміне, але, мяркую, нават у блізкім, пазаеўрасаюзным, замежжы.

У сувенірнай кашулі прадбачана замала прасторы для пояса Пятра Скепкі

Праф. Казімеж Рымут: Думаю, што ўвядзенне двайных назваў — польскіх і ў беларускім варыянце — у нічым не паўплывае на суцэльнасць дзяржавы

Роля мовы і ўласных назваў у самаідэнтыфікацыі нацыянальных і этнічных меншасцей на Беласточчыне

Міхал КАНДРАЦЮК

У час паўсюднай у свеце глабалізацыі, будавання Новай Еўропы, паасобныя людзі, грамадскія групы, а нават цэлыя нацыі вымушаны ахоўваць сваю тоеснасць і інтэгральнасць. Нацыянальным і этнічным меншасцям, так як і нацыям, характэрная культурная супольнасць. Для вызначэння і вылучэння як нацыянальных, так і нацменшасных, этнічных і рэгіянальных груп своеасаблівымі фактамі культуры з'яўляюцца мова, рэлігія, традыцыя, звычаі, мастацтва, арганізацыя. Яны важныя, паколькі інтэгруюць нацыянальную і, расцярушаныя або ўплаўленыя ў пераважнае ў культурным плане грамадства, нацменшасныя, этнічныя і рэгіянальныя групы.

Прыняты Сеймам Рэчы Паспалітай *Закон ад 6 студзеня 2005 г. аб нацыянальных і этнічных меншасцях і рэгіянальнай мове* рэгулюе справы захавання і развіцця культурнай тоеснасці нацыянальных і этнічных меншасцей ды рэгіянальнай мовы, а таксама спосаб рэалізацыі прынцыпу роўнага трактавання асоб, нягледзячы на іх этнічнае паходжанне, ды вызначае задачы і кампетэнцыі органаў урадавай і самаўрадавай адміністрацыі ў гэтай сферы.

Адным з цэнтральных пытанняў, якія датычаць правоў нацыянальных меншасцей, з'яўляецца права на ўжыванне ў публічным жыцці — у кантактах з адміністрацыяй — роднай мовы меншасці, у тым ліку права на ўжыванне родных уласных назваў (імёны і прозвішчы, назвы населеных пунктаў і фізіяграфічных аб'ектаў). Дадатковыя традыцыйныя назвы на мове нацыянальнай меншасці побач афіцыйных польскіх назваў могуць прымяняцца ў гэтых гмінах, у якіх дапушчана да ўжытку, побач афіцыйнай польскай мовы, дапаможная мова меншасці.

Дапаможную мову можна ўжываць толькі ў гмінах, у якіх лічба жыхароў гміны, што належаць да меншасці, мова якой мае стаць дапаможнай, складае не менш 20 працэнтаў ад агульнай колькасці насельніцтва гміны, і якія былі занесены ва Урадавы спіс гмін, у якіх прымямяецца дапаможная мова.

У межах цяперашняга Падляшскага ваяводства знаходзіцца больш за дзесяць гмін, якія адпавядаюць патрабаванням закону, дазваляючаму ўвесці мову нацыянальнай меншасці ў якасці дапаможнай, побач польскай, у кантактах з публічнымі ўладамі. У гэтах гмінах пражываюць польскія грамадзяне беларускай і літоўскай нацыянальнасцей, а іх лік быў устаноўлены ў выніку ўсеагульнага перапісу насельніцтва ў 2002 годзе.

Ян Сычэўскі, старшыня Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства, былы дэпутат Сейма, у „Беларускім календары" на 2004 год пісаў так: „Вынікі перапісу адносна нацыянальных меншасцей як у краіне, так і ў Падляшскім ваяводстве выклікалі і выклікаюць сур'ёзныя пярэчанні наконт іх аб'ектыўнасці як у асяроддзі паасобных нацыянальных меншасцей, так і з боку меншасных няўрадавых арганізацый. Вынікі ў адносінах да рэальнага стану ў вялікай ступені заніжаныя, часам у некалькі разоў, як хаця б у выпадку беларускай меншасці". Далей пералічвае ён шэраг істотных фактараў, якія ў рознай ступені паўплывалі на вынікаючы з перапісу стан рэчаў. Гэта, між іншым: балючае мінулае, памяць аб якім перадаецца з пакалення ў пакаленне; паскораны працэс асіміляцыі, асабліва маладога пакалення, у гарадах; адсутнасць паслядоўнай, прыязнай да нацыянальных меншасцей шматгадовай палітыкі дзяржаўных і самаўрадавых улад; частыя праявы неталерантнасці і ксенафобіі, а часам адкрытай варожасці да нацменшасцей у нашай краіне; кур'ёзныя, як на ўмовы дэмакратычнай дзяржавы, паводзіны палітыкаў розных узроўняў, а некалі і духоўных асоб, якія дэманструюць адмоўнае стаўленне да меншасцей; тэндэнцыйнае стаўленне лічыльшчыкаў, якія ў час перапісу ігнаравалі пытанне пра нацыянальнасць або самавольна фармулявалі адказы на іх. Ян Сычэўскі выказвае надзею, што „інтэграцыя Польшчы з Еўрасаюзам вымусіць паступовае выкананне стандартаў адкрытага грамадства і прынцыпаў дэмакратыі таксама і ў гэтай сферы, (...) а публічная заява аб сваёй нацыянальнай ці рэлігійнай тоеснасці не будзе ўжо надзелена рысамі рызыкі або страху".

Паводле апошняга Усеагульнага перапісу насельніцтва ў Падляшскім ваяводстве на агульны лік 1 208,6 тыс. чалавек палякамі назвалі сябе 1 135,5 тыс. грамадзян (93,9%). З іншай нацыянальнасцю ідэнтыфікавалася 55,2 тыс. чалавек (4,6%), але ў дачыненні да 18,1 тыс. чалавек (1,5%) не ўстаноўлена нацыянальнай прыналежнасці, галоўным чынам з-за адсутнасці адказу. Прыналежнасць да беларускай нацыі дэкларавала 46,6 тыс. чалавек, а да літоўскай — 5,2 тыс. У больш за дзесяці гмінах Падляшскага ваяводства лік беларусаў і літоўцаў перавышае 20%, а ў некаторых перасягае 80 і 90% ад агульнай колькасці насельніцтва.

Апрача беларусаў і літоўцаў у Падляшскім ваяводстве жывуць грамадзяне ўкраінскай (1,4 тыс.) і рускай (0,6 тыс.) нацыянальнасцей ды татарскай этнічнай меншасці, аднак па сваёй колькасці яны не задавальняюць патрабаванняў закону і не маюць права ўжываць сваю мову ў якасці дапаможнай перад органамі адміністрацыі гміны ці горада.

Для большасці пражываючых у Польшчы нацыянальных меншасцей мова выконвае ролю асноўнага элемента іх ідэнтыфікацыі. Менавіта таму сярод рыс, неабходных для вызначэння і вылучэння нацыянальных, нацменшасных і этнічных груп, мова займае першае месца, перад такімі фактамі культуры як рэлігія, традыцыя, звычаі, мастацтва і т.п.

Моўны фактар у самаідэнтыфікацыі жыхароў Беласточчыны ў адносінах да нацыянальнай прыналежнасці не самы найважнейшы. Вось як аб гэтым піша праф. Станіслаў Глінка, даследчык усходнеславянскіх гаворак на тэрыторыі паўднёвай часткі цяперашняга Падляшскага ваяводства: „Варта звярнуць увагу, што вывады наконт нацыянальнай прыналежнасці жыхароў Беласточчыны, зробленыя на аснове гаворкі, якой яны карыстаюцца, могуць давесці да памылак. Нацыянальная свядомасць не фармавалася тут паводле моўнага крытэрыю. Асноўную ролю адыграла веравызнанне. Прытым няважнае, ці хтосьці верыць ці абыякава ставіцца да рэлігіі. Вырашае бадай выхаванне ў акрэсленым асяроддзі. Такім чынам размаўляючыя штодзень на беларускай гаворцы католікі ў ваколіцах Саколкі і Дубровы-Беластоцкай лічаць сябе палякмі, а праваслаўныя з-пад Бельска-Падляшскага ці Сямятыч — пераважна беларусамі, хаця іх дыялект змяшчае ў сабе шмат украінскіх рыс".

Важным правам еўрапейскіх нацыянальных меншасцей, гарантаваным Еўрапейскай хартыяй рэгіянальных і меншасных моў, ухваленай Радай Еўропы 22 чэрвеня 1992 г., з'яўляецца прыцып змяшчаць на ўсіх публічных інфармацыйных стэндах у рэгіёне дадзенай меншасці назваў на яе роднай мове, побач назваў на афіцыйнай мове дадзенай краіны. Ідзе тут пра назвы вёсак і гарадоў, назвы вуліц і гарадскіх аб'ектаў, а таксама ўстаноў, школ, арганізацый, гістарычных помнікаў і т.п.

Уласныя назвы на мовах нацыянальных і этнічных меншасцей займаюць асаблівую пазіцыю. Апрача звычайнай ідэнтыфікацыйнай ролі выконваюць яны функцыю сімвала і эмацыйную функцыю, вельмі важную ў самаідэнтыфікацыі нацыянальнай супольнасці і яе інтэграцыі. Дадатковыя традыцыйныя назвы на мове меншасці, размешчаныя побач афіцыйных назваў дадзенай краіны, з'яўляюцца публічнай маніфестацыяй існавання гэтай меншасці, доказам жывога пачуцця тоеснасці дадзенай меншаснай супольнасці.

Мясцовыя і асабовыя назвы з'яўляюцца каштоўнай крыніцай у даследах мовазнаўцаў, археолагаў, гісторыкаў, этнографаў і геаграфаў. Расказваюць яны аб мове народа, які прысвоіў гэтыя назвы, змяшчаюць у сабе рысы дыялектаў дадзенай ваколіцы, у якой яны запісаны і да якой яны належаць. Геаграфічная назва абазначе не толькі месца на паверхні зямлі. Яна — таксама і гістарычны факт. У кожнай назве закадаваны акрэслены сэнс, нейкі змест, натуральныя ўласівасці навакольля, здабыткі грамадскай і духовай культуры чалавека ці факт з жыцця першых жыхароў пасялення.

Дадатковыя назвы мясцовасцей на беларускай мове побач афіцыйных польскіх назваў будуць сімвалам нацыянальнай тоеснасці беларускай меншасці ўплаўленай у грамадскасць з пераважнай польскай культурай, праявай шанавання правоў гэтай меншасці і талерантнасці ў адносінах да ўсіх іншых нацыянальных і этнічных меншасцей у шматканфесійным і шматкультурным Падляшскім ваяводстве. Гэтая этнічная і моўная разнароднасць нашага ваяводства стане турыстычным атракцыёнам у рэгіёне, які называюць „Зялёнымі лёгкімі Польшчы", разам з вядомай ва ўсёй Еўропе Белавежскай пушчай.

Пяць гадоў да прыняцця *Закону аб нацыянальных і этнічных меншасцях ды рэгіянальнай мове* вядомы мовазнаўца — анамаст праф. Казімеж Рымут, тадышні старшыня Камісіі па ўстанаўліванні назваў мясцовасцей і фізіяграфічных аб'ектаў, на Міжнароднай анамастычнай канферэнцыі ў Беластоку так выказаўся ў справе гучання генетычна беларускіх і двайных назваў: „У прынцыпе справа ў тым, каб абмежаваць уздзеянне адміністрацыйных і палітычных фактараў ды дазволіць назвам жыць сваім жыццём", і далей падкрэсліў: „Думаю, што ўвядзенне двайных назваў — польскіх і ў беларускім варыянце — у нічым не паўплывае на суцэльнасць дзяржавы".

***Прафесар Міхал Кандрацюк** — мовазнаўца, беларусіст, супрацоўнік Кафедры беларускай філалогіі Універсітэта ў Беластоку.*

Вяртанне да еднасці

„Мы, жыхары Сейненскай зямлі, памятаючыя сваю пяцісотгадовую ягелонскую традыцыю, уфармаваную пасля грунвальдскай вікторыі польскага, літоўскага, рускага і татарскага народаў, у 440 гадавіну Люблінскай уніі, маючы на ўвазе супольнае дабро і будучыню пасля гадоў небыцця, спрычыненага трыма падзеламі Айчыны, урачыстым актам вяртаем жыццю назву ды герб і сцяг Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў на Сейненскай зямлі”, — такая сімвалічная дэкларацыя была ўрачыста падпісана 26 чэрвеня ў Сейнах.

Анна Фіёнік падпісвае дэкларацыю аднаўлення назвы Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў на Сейненскай зямлі

Свае подпісы пад ёю паставілі прадстаўнікі ўзгаданых у ёй нацыянальнасцей. З беларускага боку — Анна Фіёнік з Музея малой айчыны ў Студзіводах, з татарскага — Стэфан Карыцкі, старшыня Цэнтральнай рады Саюза татараў у РП, з літоўскага — Альгерд Віактар, старшыня ўправы Літоўскага таварыства імя св. Казіміра. Галоўным ініцыятарам вяртання ягелонскіх герба і сцяга Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў на Сейненскай зямлі было мясцовае Таварыства аховы помнікаў даўніны. Праз год, каля касцёла Дабравешчання Прасвятой Дзевы Марыі, у месцы, дзе адбыліся ўрачыстасці, між іншым умураванне дэкларацыі і ўзняцце на мачту сцяга Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў (з польскім арлом, літоўскай і беларускай пагоняй ды татарскай тамгай і гербам Сейнаў) мае быць арганізаванае святкаванне 600-годдзя Грунвальдскай бітвы.

У час урачыстасці бурмістр Сейн Ян Станіслаў Кап адзначыў:

— У сэрца свае рацыі, якіх розум не ведае, людзі, якія маюць свае карані, кахаюць рацыі сэрца. Сёння знаходзім мы карані нашай тоеснасці, умацаванай пяццю стагоддзямі супольнага жыцця.

Роберт Ключнік, старшыня Згуртавання Сейненскай зямлі:

— Праз гады мы прабуем вярнуцца да даўняй ягелонскай ідэі ў духу еднасці. Адкрываем новы раздзел гісторыі.

Раней, у час набажэнства ў сейненскім касцёле Дабравешчання ПДМ, пробашч гэтай парафіі ксёндз Збігнеў Бздак пераконваў:

— Хочам спаслацца на гэтую спадчыну, якую пакінулі нам нашы продкі. Спадчыну, аснаваную на ўзаемным ушанаванні, на талерантнасці, рэлігійнай і палітычнай свабодзе, на будаванні супольнага дабра.

Кс. Бздак сцвердзіў, што шматнацыянальная і шматканфесійная Рэч Паспалітая Абодвух Народаў была нейкай папярэдніцай сённяшняга Еўрасаюза.

У зачытаным лісце, падляшскі віцэмаршалак Багуслаў Дэмбскі (у Падляшскай маршалкоўскай управе адказны перш за ўсё за ахову здароўя) напісаў: „Адзначаючы каштоўнасць традыцыі, якую перад вякамі прынясло заснаванне Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў ды ўспамінаючы аб умовах неабходных для гарманічнага функцыянавання, мы павінны пастарацца, каб гэтая дэкларацыя стала пачаткам узмацняння адносін паміж польскім, літоўскім, беларускім і татарскім насельніцтвам”. Дадаў: „Памятайма, што ў еднасці сіла і пастараймася з’яднацца вакол таго, што самае каштоўнае — спадчыны нашых культур”.

Кшыштаф Чыжэўскі, кіраўнік Асяродка „Паранічча — мастацтваў, культур, народаў” у Сейнах у размове з „Нівай” і Радыё „Рацыя” сказаў:

— Я рады, што спасылаемся на ягелонскую традыцыю і лічу, што з’яўляемся на этапе пераацэньвання ўспрымання гэтай спадчыны, якая цэлымі вякамі была цяжкая. Хоць крыху апасаюся, што гаворым, што хочам быць разам, а такія падзеі арганізуюцца толькі палякамі, а іншыя народы маюць толькі сімвалічнае прадстаўніцтва. Я хацеў бы, каб такая дэкларацыя, як падпісаная сёння, была таксама па-беларуску і па-літоўску. Трэба спасылацца на традыцыю, але таксама пераломліваць тое, што шмат гадоў стварала праблемы. Сёння наш патрыятызм можам будаваць на супольнасці, на размове аб гэтым, што пабудова добрых суседскіх традыцый з’яўляецца патрыятычным абавязкам. І гэта вялікая змена, якая адбываецца тут, на паграніччы. Яшчэ да нядаўняга часу патрыятызм заключаўся на перамаганні суседа.

Урачыстасці ў Сейнах завяршылі выступленні польскіх, літоўскіх і беларускіх ансамбляў. Захаплялі, м.інш., беларускія песні ў выкананні дзяўчат з „Жэмэрвы”, якая дзейнічае пры Музеі малой айчыны ў Студзіводах.

Рэч Паспалітая Абодвух Народаў існавала ў 1569-1795 гадах, значыць, ад моманту падпісання Люблінскай уніі да трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай. Дзяржава была распаложана на большасці тэрыторыі Польшчы, Літвы, Беларусі, Украіны, часткова Латвіі, Эстоніі, Расіі, Малдовы і Славакіі. У 1618 г. дасягнула яна найбольшага абшару: 1 млн. 153 тыс. квадратных кіламетраў, пражывала ў ёй 14 мільёнаў чалавек. Была яна найбольшай па тэрыторыі дзяржавай у Еўропе і другой (пасля Францыі) па ліку жыхароў. Па нацыянальным прынцыпе палякаў было 40% ад агульнага ліку насельніцтва (пад канец XVIII ст. — 50%), русінаў — 20%, літоўцаў — 15%, немцаў — 10%, яўрэяў — 5%, іншых — 10%.

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Няма ў свеце такога музея, які так ці інакш не быў бы звязаны з гісторыяй. Бо гісторыя і музеі — дзве неад’емныя рэчы. Але і кожны музей мае сваю гісторыю. Некаторыя ствараюцца па загадзе з высокіх кабінетаў, а другія нараджаюцца, дзякуючы выключна намаганням апантаных аматараў. Адным з такіх музеяў, што ўзнікаюць як вынік шчырай любові да роднай зямлі, з’яўляецца Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей, які знаходзіцца ў вёсцы Гудзевічы Гродзенскай вобласці. На ягоны сайт мы сёння і завітаем.

Прадстаўніцтва гудзевіцкага музея ў інтэрнэце — **http://gudevichi-muzey.narod.ru.** Выяўленне, што размешчана на галоўнай старонцы, адразу прыцягвае ўвагу вітаннем і пачаткам расповеду пра вёску. Прычым даны расповед — запрашэнне наведаць яе. „Нашы Гудзевічы — выдатнае месца для развіцця турызму, у тым ліку і сельскага, цікавае як для нашых суайчыннікаў, так і для замежных гасцей. Мы гатовы да супрацоўніцтва з усімі зацікаўленымі арганізацыямі, шчыра рады заўсёды вітаць гасцей на нашай гудзевіцкай зямлі”, — пішуць аўтары сайта. Пасля такога гасціннага вітання цяжка абысці ўвагай астатнія старонкі, якіх не надта многа і выйсці да іх месцяцца як з левага боку, так і ўверсе выяўлення.

У рубрыцы „Гісторыя” распавядаецца пра тое, якім чынам узнік музей у вёсцы. Аказваецца, усё пачалося са школьнага кабінета. Менавіта там у 1968 годзе, дзякуючы намаганням былога настаўніка беларускай мовы і літаратуры Алеся Белакоза, прыняў сваіх першых наведвальнікаў школьны літаратурна-краязнаўчы музей. Адкрыццё музея было прымеркаванае да 130-годдзя з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага.

Экспанатамі музея з самага пачатку былі запісаныя выказванні пра беларускую мову, чарнавікі ці рукапісы твораў беларускіх пісьменнікаў, кнігі з іх аўтографамі. Потым пад музей адышоў цэлы будынак старой школы, бо ў пасёлку пабудавалі новую. З цягам часу сярод экспанатаў музея з’явілася хатка, пабудаваная ў канцы XVIII стагоддзя, і нават свіронак. А сам музей стаў называцца дзяржаўным.

Трэба прызнаць, што далёка не кожная вёска мае такі музей, які вельмі падрабязна распавядае пра яе. Гудзевічы маюць. У 1997 годзе ў ім была зроблена зала „Гісторыя Гудзевіч у дакументах і фотаздымках”. Ёсць таксама зала „Гудзевічы ў мастацтве”.

Аб тых выставах, што маюць месца ў гудзевіцкім музеі, распавядаецца на старонцы „Выставы”. Сярод іх не толькі выставы, прысвечаныя вядомым і слынным асобам, але і тыя, што распавядаюць пра творчасць нашых сучаснікаў, напрыклад, творчасць удзельнікаў гурткоў Мастоўскага раённага цэнтра пазашкольнай работы.

Сайт дазваляе зрабіць віртуальную экскурсію па хатцы XIX стагоддзя — у рубрыцы „Галерэя” знаходзяцца фотаздымкі таго, што змешчана ўнутры старадаўняга вясковага будынка. Ёсць таксама магчымасць паглядзець і на тыя экспанаты, якія дэманструюцца ў залах музея.

Было б дзіўна, калі б на сайце не распавядалася аб вёсцы. Старонка з назвай „Гудзевічы”, выйсце на якую месціцца ўверсе выяўлення, дае хай невялікую, але досыць поўную інфармацыю пра населены пункт, які цяпер лічыцца аграгарадком.

Праўда, уладальнікам сайта яшчэ ёсць над чым працаваць — рубрыка „Навіны” пакуль не выконвае свайго прызначэння — навінаў там няма. Ва ўсім жа астатнім сайт выклікае толькі добрую зайздрасць за вёску Гудзевічы.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

На юніёрскіх франтах

Цэнтральнымі спартовымі падзеямі мінулага тыдня сталі старт 96-й у гісторыі знакамітай велагонкі „Тур дэ Франс”, а таксама фінальныя матчы старэйшага тэніснага спаборніцтва з серыі „Вялікага шлема” — Уімблдонскага турніру. У „Вялікай пятлі” трэці год запар бяруць удзел і беларускія прадстаўнікі — спецыяліст па адрывах Аляксандр Кучынскі выступае за італьянскую каманду „Ліквігас”, а вядомы спрынтар Яўген Гутаровіч за французскі клуб „Франсэс дэ Жэ”. Пакуль на самай прэстыжнай гонцы на роварах ім далёка да лаўраў. На Уімблдоне таксама да фіналаў наш ас парнага разраду Максім Мірны і прыма Вікторыя Азаранка дацягнуць не здолелі.

А асноўны ўдзел беларускіх спартоўцаў быў заўважаны на розных юніёрскіх кантынентальных чэмпіянатах, у тым ліку і ў згаданых відах. І пахваліцца, напраўду, беларускаму рэзерву ёсць мала чым.

На юніёрскім тэніснym Уімблдонскім турніры наш Андрэй Васілеўскі (70-ы нумар сусветнага юніёрскага рэйтынгу) выбыў з розыгрышу ў трэцім крузе. На гэтай стадыі ён прайграў у двух сетах амерыканцу Джордану Коксу. А ў парным разрадзе Васілеўскі разам са сваім партнёрам Александрасам-Фердам Геаргудасам з Нямеччыны саступілі ў паўфінале французам Жульену Абры і Андрыяну Пужэ.

На баскетбольным першынстве Еўропы сярод дзяўчат да 18 гадоў у дывізіёне „А” Беларусь прадстаўлена вылучна гарадзенскай камандай „Вікторыя” пад кіраўніцтвам сямейнай пары трэнераў Вікторыя Дацун — Аляксандр Шымкавяк. У шведскім горадзе Сёдэрталье беларускі выступалі ў адной групе з Італіяй, Літвой і Чэхіяй. У наступны раўнд выходзілі тры лепшыя дружыны, але нашы ўсім прайгралі і трапілі ў пульку, што аспрэчыць месцы з 13 па 16-е. Тут важна хоць бы захаваць прапіску ў мацнейшым дывізіёне.

У іншым шведскім горадзе — Гётэборгу — на юніёрскім чэмпіянаце па гандболе сярод гульцоў да 19 год беларускія хлопцы, якіх трэніруе Уладзімір Азаў, пачалі за здароўе, а скончылі няўдала. Прычым гулялі з метамарфозамі — на старце адолелі моцных Чэхію і Нарвегію, потым прайгралі ўкраінцам і аўстрыйцам, а ў апошнім туры разгрэмілі Турцыю. У выніку ж зборная Беларусі не здолела выйсці ў васьмёрку мацнейшых. Першынствавалі ў групе нарвежцы, а тры каманды набралі па 6 ачкоў. На жаль, па дадатковых паказчыках нашы далей не прайшлі. А ў аспрэчванні 9-16-га месца сталі выступаць няўдала. Спярша саступілі Венгрыі — 21:22, потым разышліся мірам з Ізраілем — 20:20. І ўрэшце завяршылі выступ на мінорнай ноце — прайграўшы Румыніі 30:32 — нашы гандбалісты занялі толькі 14-е месца.

Не маюць высокіх дасягненняў і майстры хутка круціць педалі на юніёрскім першынстве кантынента, што праходзіць у Бельгіі. Лепшым з беларускіх хлопцаў у першай гонцы з раздзельным стартам стаў Ілья Кашавы, які паказаў 28-ы вынік сярод 65 удзельнікаў. У нашага Станіслава Божкава — 34-ы час, а Андрэй Голубеў заняў 40-е месца. Перамог у пралогу брытанец Джозэф Пэрат. У наступнай гонцы мацнейшым з айчынных гоншчыкаў стаў Андрэй Красільнікаў, які быў 22-ім. Максім Кумялеўскі заняў 44-е месца, услед адразу фінішаваў Сяргей Новікаў. Пераможцам стаў немец Марсель Кітэль. Усяго на старт на роварах выехала 60 спаборнікаў. Не лепшыя паказчыкі і ў нашых дзяўчат на гэтым чэмпіянаце.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Разам з „Нівай”

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

Калісьці прапанаваў я арганізаваць сустрэчу ніўсіх карэспандэнтаў у „тэрэне”. Міхась Куптэль падтрымаў ідэю і пахадайнічаў за аргнізаваннем спаткання гайнаўскага авангарда ў Беларускім самаўрадавым форуме, што змяшчаецца па вуліцы Бучка ў Гайнаўцы. Але ідэя правалілася, паколькі апрача нас двух ды гаспадароў памяшкання (Міхася Андрасюка і Міхася Голуба) ніхто не з’явіўся. А разлічвалі прынамсі на Мікалая Панфілюка, Грышу Мароза і Петруся Байко. Неаднойчы сумую за кампаніяй, бо, ўсё ж такі, ёсць аб чым паталкаваць у сям’і ніўскіх супрацоўнікаў. З прыемнасцю ўспамінаю ніўскі юбілей 50-годдзя. Другой такой імпрэзы, на жаль, не дачакаем. Даўней я часценька наведваў рэдакцыю, ды абменьваўся думкамі з журналістамі. Зараз здароўе не дазваляе. Рашыў я затым запрасіць да сябе „Ніву”. І маю просьбу выканалі. А было гэта ў панядзелак, 22 чэрвеня .

Прыехалі на „бусіку” пасля работы поўнай кампаніяй. Не хапіла адно Яўгена Мірановіча, Алега Латышонка, Аліка Максімюка і Колі Ваўранюка. А шкада, бо іх лічу сваімі сардэчнымі калегамі. Праз некалькі дзесяткаў гадоў разам „працiралі” ніўскі шлях. На такіх сяброў можна разлічваць у самы цяжкі час. І „Ніва” дала мне духовую падтрымку ў дні спасціглага мяне гора, за што яшчэ раз шчырае дзякуй.

Пікнік арганізавалі мы пад адкрытым небам, на ўлонні натуры. Надвор’е паспрыяла. Хоць рана ліў дождж і здавалася, што так будзе цэлы дзень, але пасля абеду Усявышні паслаў нам цудоўную пагоду. Атмасфера ў кампаніі была сямейная, свойская. Большасць журналістаў упершыню гасцявала не толькі ў маёй хаце, але і ў Кузаве. Пакарысталіся яны нагодай ды зведалі Рэпчыцкі вадаём і вёску. Міра Лукша, напрыклад, пажадала пабачыць родны кут ніўскага паэта Уладзіміра Саўчука ды захаплялася цудоўным пахам язміну, які акаляе сядзібу майго суседа Івана Саўчука. Не было, праўда, кастра, але быў грыль і печаныя каўбаскі. Не адным візітам уцешылі мяне ніўскія сябры. Паводле традыцыі, калі едуць „у адведкі”, прывезлі мне ў падарунку „станцыю пагоды”, якая прадвяшчае надвор’е. Пісаў я ў допісе, што раблю занатоўкі аб пагодзе, таму кемлівыя калегі прыдбалі мне каштоўны падарунак. І за гэта ім шчырае дзякуй ад усяго сэрца, бо гэты прыбор будзе доказам сапраўднага сяброўства з ніўскай сям’ёю. Развіталіся мы пры першых поцемках у вясёлым настроі і з беларускай песняй. Каб здароўе яшчэ паспрыяла і была чарговая нагода для супольнага застолля ў шырэйшым коле ніўскіх супрацоўнікаў. Таго ўсім ад шчырага сэрца жадае

Уладзімір СІДАРУК

85-я ўгодкі Васіля Быкава ў ТБК Літвы

Імпрэза ў Таварыстве беларускай культуры, якая адбылася 27 чэрвеня, была прысвечана 85-м угодкам народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Кола чальцоў ТБК у чэрвені 2004 г. наведала Усходнія могілкі ў Мінску — апошні прытулак пісьменніка. Далей наша вандроўка працягвалася на Віцебшчыну. Мы шукалі вёску Бычкі, але тады наведаць малую радзіму Быкава не атрымалася. Цяпер з дакладам пра творчую спадчыну Васіля Быкава выступіла Леакадзія Мілаш, было прачытана апавяданне „Да родных месц”. Тыя, хто прысутнічаў, дасведчаныя ў творчасці пісьменніка. У ТБК ён выступаў двойчы: першы раз, калі адкрывалі табліцу Браніславу Тарашкевічу, другі — калі ў Вільні адбылася прэзентацыя кнігі „Альпійская балада” на літоўскай мове (1994 г.). Быў гэта апошні прыезд Быкава ў Вільню. Затым увагу прысутных займеў госць з Мінска, вядомы рэжысёр Алег Дашкевіч, які распавёў аб сустрэчы з Васілём Быкавым. Калі ён браў інтэрв’ю ў пісьменніка, то так хваляваўся, што націснуў не на тую кнопку дыктафона і ў выніку атрымаўся партрэт без голасу. Прыйшлося шукаць новае выйсце, каб выправіць памылку.

Старшыня ТБК Хведар Нюнька расказаў аб сваіх уражаннях ад сустрэчы з Быкавым. Назаўсёды запомніліся паховіны пісьменніка.

Наступны выступоўца — госць з Варшавы, навуковец Міраслаў Янковяк, які даследуе беларускую мову ў памежных рэгіёнах Латвіі і Літвы. Ужо ёсць кніга, вынік ягонай працы, якая зойме пачэснае месца ў бібліятэцы ТБК, цікавая для гісторыкаў, этнографаў, беларусаведаў і тых, хто цікавіцца беларускай культурай.

У ТБК стала традыцыяй знаёміцца з фільмамі незалежных рэжысёраў Беларусі. Была прэзентацыя фільмаў Уладзіміра Коласа, Вольгі Мікалайчык. Гэтым разам адбылася прэзентацыя фільма Алега Дашкевіча „Журналісты”. На пачатку прадзюсар Вольга Мікалайчык прадставіла рэжысёра. Фільм не аставіў абыякавым нікога з прысутных, некаторыя з захапленнем глядзелі яго ўжо некалькі разоў. Фільм дакументальны, эпатажны. Гэта частка новай гісторыі Беларусі: факты, падзеі. Пачатак фільма: 1994 год, будучы прэзідэнт краіны абяцае: „У Беларусі павінны быць і дзяржаўная прэса, і незалежная”. Прайшло 15 год. Незалежная прэса знаходзіцца ў падполлі. Многія таленавітыя журналісты пакінулі краіну, а тыя, хто застаўся, заслугоўваюць павагі і пашаны. Яны аставяць пасля сябе след у новай гісторыі Беларусі, за імі будучыня. Фільм „Журналісты” быў паказаны амаль на ўсіх кантынентах. Паказ у ТБК стаў падзеяй для віленскіх беларусаў. Фільм папоўніў фанатэку ТБК, многія з прысутных атрымалі кампакт-дыск у падарунак.

Напрыканцы імпрэзы выступіў украінскі ансамбль „Світліця”. Украінскія артысты адзначылі: „Такога фільма на Украіне няма”. Фільм „Журналісты” будзе паказаны на кінафестывалі ў Львове.

Абмеркаванне працягвалася за кубкам гарбаты ў старшыні ТБК Хведара Нюнькі. Ён надзейны тыл у Вільні для незалежных журналістаў.

Жыве Беларусь!

Леакадзія МІЛАШ

Выступае Леакадзія Мілаш

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — італьянскую пагаворку.

1. змагарная сутычка, барацьба = 6 _ 4 _ 5 _;

2. беларуская адраджэнская газета, якую ў 1916-1918 гадах выдаваў у Вільні Вацлаў Ластоўскі = 39 _ 38 _ 36 _ 40 _ 37 _;

3. народная лірычная песня румын і малдаван = 8 _ 25 _ 26 _ 9 _18 _;

4. пара года амонімная з рэкай забыцця = 22 _ 23 _ 24 _ 21 _;

5. балотны газ ад злучэння вадароду з вугляродам (CH_4) = 14 _ 2 _ 3 _ 15 _ 1 _;

6. горад між Бруселем і Антверпіяй = 17 _ 16 _ 27 _ 35 _ 19 _ 7 _ 34 _;

7. вадкасць з падскурных залоз, сімвал працяглай і напружанай працы = 30 _ 29 _ 28 _;

8. сталіца Латвіі = 31 _ 10 _ 33 __ 32 _;

9. іспанскі народны танец (*jota*) = 11 _ 13 _ 12 _ 20 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 23 нумара

Слова, партыя, май, ударнік, бондар, шрыфт, вагон, расток, разгон, Бразавіль, сядло, патруль.

Рашэнне: **Мудры вораг больш варты за дурнога сябра.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Мірaслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Апараты для міжпланетных падарожжаў

Лістапад 1952 года. Аляксей Казбярук, семнаццацігадовы вучань дзевятага класа ў міхалоўскім ліцэі высылае з Юшкавага Груда адказ на анкету ў штотыднёвіку „Nowa Wieś”: „Як уяўляю сабе маё жыццё і жыццё маёй вёскі праз пяць гадоў”. Алік кахае Тамару, ходзіць у школу і плануе стаць кімсьці... Марыць: вывучыцца, будзе будаваць апараты для міжпланетных падарожжаў... Марыць лятаць. Але сам ён дробны, нясклады, са слабымі вачыма. Такі Ікар з невялічкай беларускай вёскі, што ледзь адхайкалася пасля нядаўняй вайны.

Міра ЛУКША

„Пасля заканчэння школы прагну быць авіяканструктарам, каб будаваць апараты для міжпланетных палётаў. Буду старацца, каб у адкрыцці іншай планеты або нейкай з’явы ў сусвеце быў і мой уклад. Я, сын сяроднезямельнага селяніна з Беласточчыны, даўняй Польшчы Б, цяпер смела магу глядзець у будучыню, паколькі маю будучыню гарантуе мне Канстытуцыя Польскай Народнай Рэспублікі.

Магу таксама смела думаць пра будучыню маёй вёскі — Юшкавага Груда. У нас ёсць яшчэ індывідуальныя гаспадаркі. Праз пяць гадоў будзе тут калгас. Цяпер тут хаты. Праз пяць гадоў кожны будзе жыць у прыгожым доме з агародам, у якім будуць расці прыгожыя кветкі і гародніна. Калгаснікі пабудуюць супольныя аборы для пародзістай жывёлы, шпіхеры для збожжа ды паставяць памяшканні для машын, паколькі працу чалавечых рук заменяць складаныя машыны, прыводжаныя ў рух чалавекам. Здзейсняцца мары нашых патрыётаў”.

Праз пару гадоў зямляне пачалі асвойваць космас, не справіўшыся са сваімі асноўнымі турботамі, якія і да гэтай пары, праз больш чым паўстагоддзя, ні на каліва не сталі менш складанымі. А Алік Казбярук, які ўсё ж не сканструяваў ніякай прылады для палётаў у неба, увесь час сачыў за заваёвай космасу чалавекам. Чуў, як паляцелі касманаўткі - сучкі Лайка, Стрэлка ды Белка, даведаўся, як згарэў у касмічнай прасторы сын Канстанціна Цыялкоўскага, які паляцеў у космас да Юрыя Гагарына, сачыў за ўсімі палётамі і вяртаннямі зямлян з усё неразгаданага неба. Сам на яго не ўзнёсся і не збудаваў ніякай прылады для асвойвання касмічных прасцораў. Але не забыўся пра свае мары. Паслаў нядаўна свой стары, па-пароцку казачны ліст у Байканур... І пра Юшкаў Груд усё распытвае сваіх землякоў, не такі далёкі да ягонага цяперашняга, зноў вясковага жытла пад Пішам.

— Калі я нарадзіўся?.. Дакладна 29 ліпеня 1935 года. Тата толькі запісаў іншую дату. Але дакладная дата будзе вырыта ў будучым годзе... на маім надмагільным помніку! — сур’ёзна кажа цяпер ужо пенсіянер, жыхар вёскі Лупкі. Вядомы ў Польшчы народны доктар лекавання травамі, спецыяліст па водных цёках і геамантыі. Авіятарскай справай не заняўся, хоць у форму быў трапіў. І ўдакладняе: — Калі атрымаю загад станавіцца на апошні суд, загадаю спаліць мяне і... рассыпаць па траве і вадзе... Калі б жыла Тамара, было б ёй, пэўна, сумна.

Нарадзіўся ён у Юшкавым Грудзе як адзін з пецярых дзяцей. Усе яны, апрача аднаго брата, здабылі вышэйшую адукацыю. Адна сястра з’яўляецца лекарам. І сам ён вынайшоў лякарства, якое, кажуць, лечыць самыя розныя хваробы, ад страўніка да лёгкіх. Доктар філасофіі з Лодзі, якая ішла ўжо на другую аперацыю, прымала ягоную панацэю, і непатрэбным стала хірургічнае ўмяшанне. Лякарства змяшчае 160 кампанентаў, ёсць там між іншым амерыканская чарніца ды журавіна. Зацікаўлены вырабам гэтай панацэі люблінскі „Гербаполь”. Вынаходніку не залежыць на грашах, толькі на тым, каб ягонае вынаходства прыдалося ў вяртанні людзей да здароўя.

— Калі б Тамара жыла... Я ўпэўнены, што яе ўратаваў бы, вылечыў бы яе лёгкія...

Распрацоўвае карту месцаў у краіне, дзе здараецца найбольш дарожных аварый. Трымае прытым кантакт з іншымі навукоўцамі неканвенцыянальных навук, таксама і замежнымі, абменьваецца вопытам.

— Некаторыя лічаць, што гэта проста выпадковасць, што ў некаторых месцах здараюцца дарожныя аварыі. Але ёсць месцы, дзе здараецца гэта ў дзесяткі, сотні разоў, і з вопытнымі, цвярозымі шафёрамі. Гэтак было і з прафесарам Браніславам Герэмкам. Гэта ясна акрэслена, дзе тыя цёкі выступаюць, і які гэта мае ўплыў на сітуацыю, якая адбываецца. Веды можна было б распаўсюдзіць сярод людзей, паставіць асцерагальныя знакі.

Тамара Саланевіч — Аляксеева зорка

Аляксей Казбярук

Сустракаюцца з Аляксеем Казберуком у ягонай вёсцы даследчыкі гэтых з’яў „таемных” таму, што нябачных простым вокам. Можа здацца гэта дзіўным, што ён, чалавек з матэматычным розумам, адстаўны палкоўнік, займаецца нейкім „чарадзействам” і знахарствам. Дарэчы, на „знахара” ён і змахвае: у атачэнні плоймы коцікаў, сабак і птушак, сярод буйнай расліннасці гэты хударлявы дзядзька сапраўды як не з гэтага свету. Устае ён ужо ў дзве гадзіны ночы, займаецца сваёй гаспадаркай, назіраннем за светам. За сваё жыццё быў афіцэрам, выкладчыкам у паліцыйнай вышэйшай школе, членам саюза польскіх пісьменнікаў (ён аўтар шасці кніжак). Меў ружжо, быў паляўнічым. Цяпер цэніць каштоўнасць кожнага жыцця, нават найменшай казявачкі. Ад мікракосмасу — да макра. Цяпер ён адзін. Хоць жыве не адзін.

— Усё трэба накарміць, выпусціць сабак у вальеру... І так памаленьку жывецца.

Над ягоным ложкам вісіць здымак Тамары Саланевіч яшчэ з ліцэйскага міхалоўскага часу.

— Устаю раніцай, гляджу на яе. І з малітвай кладуся спаць, і ўсё стаіць яна ў маіх вачах, — у голасе Аляксея дрыжаць слёзы. — Гэта было сапраўднае каханне. Разумеліся мы без слоў. А нават не пацалаваліся за ўсё жыццё.

11.07 – 17.07

(22.03. – 20.04.) Хутка і спраўна паафармляеш усе справы, якія цягнуцца ўжо месяцамі. Можаш вярнуць страчанае. Пераканаешся, што найлепш разлічваць на сябе. Калі нагаворыш шэфу, на павышэнне хутчэй не разлічвай. Бараны, якія шукаюць працу, павінны добра абмеркаваць дамову з новай фірмай.

(21.04. – 21.05.) У галаве ў цябе перш за ўсё зараблянне грошай. Хоць твае інтэлектуальныя каштоўнасці немалыя ды добрыя рысы характару, задбай і пра сваю красу, таксама пераглянь і дапоўні свой гардэроб.

(22.05. – 22.06.) Да 14.07. нішто не перашкодзіць твайму лагічнаму і практычнаму мысленню. 14-18.07. твая эластычнасць, незалежнасць і сучаснасць у дзеяннях выдатна паможа табе ў прафесійным поспеху. Можаш шмат зарабіць.

(23.06. – 23.07.) Да 18.07. можаш зрабіць штосьці непаўторнае. Будзеш клапатлівы, апекунчы, добры для іншых. Затое 11-15.07. апазіцыя Меркурыя да Ліліт падагрэе гнеў партнёра; хопіць лішняе слова, і ён зашалее ад зайздрасці і абсурдных падазрэнняў.

(24.07. – 23.08.) 11-15.07. жалюгодныя вынікі прынясе ігнараванне стану здароўя. Не ашчаджай на лекарах! На працы атрымаеш шанц увядзення ў жыццё сваіх піянерскіх ідэй. Закаханымі Львамі лёгка цяпер маніпуляваць.

(24.08. – 23.09.) З аднаго боку прагнеш кахання, з другога — будзеш сумаваць за свабодай. Твая прафесійная пазіцыя настолькі моцная і абы-хто яе не падкапае. Ушанавання для дробных і на выгляд малаважных спраў навучыць цябе Сатурн у тваім знаку. Сама ўстановіцца іерархія каштоўнасцей.

(24.09. – 23.10.) Будзеш расслаблены, поўны ініцыятывы і шалёных задум. У пачуццях раз на возе, раз пад возам. Партнёр можа цябе ашарашваць. Сямейныя пертурбацыі хутка разыдуцца па касцях і запануе згода.

(24.10. – 22.11.) 10-14.07. праблемы ў пары. Не паддавайся ніякім угаворам, не падпісвай ніякіх важных дакументаў. Не рыхтуй на нікога пасткі, каб у яе самому не трапіць. Работа гарыць у тваіх руках, шкада што не ў калег. Са сваякамі і сусядзямі ненайлепшыя лады.

(23.11. – 22.12.) Дасканалая інтуіцыя дазволіць табе ўнікнуць у справы, незразумелыя для іншых. Не ідзі наперад з незавершанымі праектамі. Адкрыюцца перад табой новыя магчымасці і ўдасца зусім выпадкова зрэалізаваць штосьці здаўна для цябе важнае.

(23.12. – 20.01.) 10-14.07. будуць добрыя нагоды ўпарадкаваць старыя справы, а таксама змабілізаваць іншых да эфектыўнай працы. У бізнесе можаш разлічваць на немалыя прыбыткі. Могуць прынесці прыбытак таксама грошы інвеставаныя калісьці.

(21.01. – 19.02.) Лёгка выплывеш на шырокія воды. Здабудзеш важныя інфармацыі, можаш узяцца за рызыканцкія мерапрыемствы. Затое будзе ламаць у касцях; хутка дойдзеш да формы.

(20.02. – 21.03.) Да 13.07. лёгка прыйдуцца табе новыя здабыткі. Многа нагод, у якіх зможаш выкарыстаць свае досвед і веды. У любоўных справах хай вырашае лёс. Хтось, хто хацеў бы падцяць табе крылы, якраз прыслужыцца табе, сабе на шкоду.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960